PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 31 (2412) Год XLVII | Беласток 4 жніўня 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Астаемся Польшчай „Б”

Аляксандр Вярбіцкі

Выбарчыя акругі ў Падляшскім ваяводстве былі вызначаны правільна; не было тут парушэння польскага заканадаўства, — так Дзяржаўная выбарчая камісія адобрыла — слєдам за Ваяводскім выбарчым камісарам — рашэнне маршалка Падляшскага ваяводства (гл. „У крузе акруг”, „Ніва” н-р 28; „Пратэст у справе выбарчых акруг”, н-р 29 і „Рух акруг”, н-р 30). Гэтае заключэнне вартавыя нашых законаў зрабілі гледзячы на прадстаўленыя ім паперы. Я, даволі выпадкова, падглянуў выказванне для беластоцкага тэлебачання Падляшскага віцэ-маршалка Дарыюша Цішэўскага — менавіта на тэму падзелу на апальныя выбарчыя акругі. І тут гэты пан палітык ускосна паведаміў, што існуе падзел нашага ваяводства на „роўных” і „раўнейшых”. Сказаў ён, што да траіх паветаў: Бельскага, Гайнаўскага і Сямятыцкага хацелі спачатку далучыць Высокамазавецкі павет, аднак у час кансультацый у тым павеце такі праект не атрымаў адабрэння. У Высокамазавецкім павеце былі нейкія кансультацыі і, паслухаўшы іх водгаласу, ваяводскае самаўрадавае кіраўніцтва рашыла паставіцца да іх станоўча і памяняць свой пачатковы намер. Пра нейкія кансультацыі ў трох „меншасных” паветах — нават са сваімі палітычнымі калегамі — пан Цішэўскі не згадаў, не гаворачы ўжо пра нейкае прыстойнае стаўленне да пратэстаў з нашага асяроддзя.

Скаржнікі новага падзелу на выбарчыя акругі будуць хадайнічаць за адмену некарыснага нашай меншасці рашэння перад Канстытуцыйным трыбуналам, зыходзячы менавіта з неканстытуцыйна рознага трактавання грамадзян нашай дзяржавы з-за іх нацыянальнай і канфесійнай іншасці. Асновай для гэтага хадайніцтва будзе не толькі асноўны юрыдычны акт Рэчы Паспалітай, але і Агульная канвенцыя дзеля аховы нацыянальных меншасцей, прынятая Радай Еўропы 1 лютага 1995 года. У прэамбуле да Канвенцыі гаворыцца: „(...) плюралістычнае і сапраўды дэмакратычнае грамадства павінна шанаваць не толькі этнічную, культурную, моўную і рэлігійную тоеснасць кожнай асобы з ліку нацыянальных меншасцей, але і стварацъ адпаведныя ўмовы дзеля выказвання, захавання і развіцця тае тоеснасці. (...) стварэнне настрою талерантнасці і дыялога неабходнае дзеля таго, каб культурная разнастайнасць ставалася ў кожным грамадстве крыніцай і чыннікам не падзелу, але ўзбагачэння”. Артыкул 15 Канвенцыі: „Бакі стварацъ умовы, неабходныя для паспяховага ўдзелу членаў нацыянальных меншасцей у культурным,

[працяг ☞ 2]

Дзяніс Вячэрскі — саліст гурту „Partyzone”.

Рок трымаецца моцна

Мікола Ваўранюк

Больш за дваццаць гуртоў зайгралі на сцэне XIII Фестывалю Музыкі Маладой Беларусі, у тым ліку дванаццаць — у конкурсе. Даўно ўжо мінуў той час, калі можна было праігнараваць конкурсныя змаганні, прыехаць на другі дзень фестывалю, паслухаць па два-тры творы пераможцаў і захапляцца зоркамі. Сёлетнія дэбютанты на гарадоцкай сцэне ўзроўнем не розніліся ад ветэранаў.

Гран-пры ўзяў „Partyzone” з Мінска. Гэты гардкоравы (ад *hardcore*) гурт быў настолькі пераканаўчым пераможцам, што атрымаў яшчэ ўзнагароды фонаграфічных студыяў Hertz і Magton — разам дваццаць гадзін запісу альбома. Нічога дзіўнага, бо хоць пад такой назвай выступае ён нядоўга, склалі яго дасведчаныя і вядомыя на мінскай рок-сцэне музыкі: гітарысты Яўген Цылікаў і Мікіта Басалаеў, бас-гітарыст Зміцер Астроўскі, бубнач Аляксей Яфрэменка і вакаліст Дзяніс Вячэрскі.

„Без назвы” з палескага мястэчка Бяроза (сумна вядомага ў міжваенны перыяд як Картуз-Бяроза) быў на „Басовішчы” ў мінулым годзе, але асаблівага ўражання пасля сябе не пакінуў. За год гурт аднак зрабіў вялікі прагрэс і ўжо пасля адборачнага канцэрта ў Мінску сталі пра яго гаварыць як пра аднаго з кандыдатаў на пераможцу. У канцы канцоў быў узнагароджаны гаспадаром: войтам Гарадоцкай гміны. Сяржук Машковіч, аўтар слоў песень гурту кажа, што назваць іх музыку цяжка. Хутчэй за ўсё пецярых хлопцаў аб'яднала супольная ідэя — любоў да беларускай культуры — ды супольны погляд на свет. І яны стараюцца выразіць гэта на сцэне, на беларускай мове.

Публіцы найбольш спадабаўся гайнаўскі гурт „Rock-4”, нязначна апярэдзіўшы баранавіцкія „Дзеі”. Паколькі першы не сабраўся, каб выйсці на сцэну ў суботу, пасля цырымоніі ўзнагароджвання, дык зайграў і заспяваў другі. Моцна, энергічна, добра. Як і ўсе выканаўцы з Беларусі. Відаць, якую станоўчую ролю адыгрываюць адборачныя канцэрты ў Мінску, якія праводзяцца там у апошнія гады. Элімінуюць яны выпадковыя калектывы, значна падымаюць узровень самога фестывалю.

Але відаць таксама, якую станоўчую ролю адыгрывае „Басовішча” ў фармаванні рок-сцэны ў Беларусі. Большасць узнагароджаных і неўзнагароджаных калектываў або ўзнікла з думкай паказацца калі-небудзь у Гарадку, або перайшла дзеля гэтага з рускай ці англійскай мовы на беларускую. Нават такія шоўмены як „Neuro Dubel”, лаўрэаты шматлікіх прызоў, якія мелі свайго вернага рускамоўнага слухача. Усе без выключэння дэкларуюць, што гэта не часовая з'ява, але ўсур'ёз. Бо ж, аказваецца, выказаць свае думкі і апісаць свет можна нядрэнна і па-беларуску.

Чатыры гурты з Беласточчыны, якія спрабавалі сваіх сіл у конкурсе, саступалі музычна тым з Беларусі. Няма ў нас, зразумела, ні такога патэнцыялу, ні такой музычнай адукацыі. Але саромецца не было чаго. Тым больш, што ў запасе былі дзве зоркі: „Ріма” і „0-85”. Калі ў мінулым годзе публіка насіла на руках першы гурт, дык сёлета падняў людзей пад сцэнай другі. Быў гэта ці не самы моцны канцэрт сёлетняга „Басовішча”.

[працяг ☞ 3]

Помнік Улашчыку ☞ 2

Помнік уяўляе сабой камень-волат з чырвонага фінскага граніту памерам 3 х 2 х 1,5 метраў, на якім замацаваны бронзавы барельеф гісторыка, яго факсімільны надпіс „Мікола Улашчык” і шыльду з адмысловым тэкстам. Помнік Улашчыку стаіць побач з помнікам Ларысы Геніюш і гэта вельмі сімвалічна, бо гэта першыя ў нас помнікі палітвязням.

Музыка паганскай містыкі ☞ 3

Славянскі базар мяне расчараваў. Было, проста, нудотна. Часам аж санліва. Большасць выканаўцаў спрабавала спалучаць джаз, соул, рок з элементамі народнай музыкі. Стаўлю піва таму, хто скажа мне, кім была ў Віцебску і як туды трапіла нейкая Беата з Познані.

Таннее стратэгічны прадукт ☞ 4

Ёсць аднак стратэгічны прадукт, на які дзяржаўныя ўлады плануюць ад новага года панізіць цану. Ідзе пра спіртныя вырабы, продаж якіх заўсёды прыносіў бюджэту вялікі прыбытак. Апошнім часам попыт рынку на прадукты краёвых спіртзаводаў паменшыўся так радыкальна, што замест спадзяваных 5 у бюджэт трапіла толькі 4 млрд. зл.

Тамара Тарасевіч ў Штатавым цэнтры ☞ 8

Карціны мастачкі, якая пакінула сваю прафесію медсястры, каб аддаць сябе мастацтву, гасцююць у бюро губернатара ўжо тры гады. Праводзілі там сем вернісажаў яе новых прац у розных стылях — ад рэалістычных пейзажаў да абстрактных карцін.

Як дайшло да бежанства ☞ 10

Адступленне рускіх войск у 1915 г. выклікала масавае бежанства праваслаўнага насельніцтва. Абавязак эвакуіравацца мелі толькі чыноўнікі. Адны, больш граматныя, уцякалі з патрыятычных меркаванняў, другія баяліся здзекаў акупанта, трэція, найменш адукаваныя, глядзелі што рабілі першыя і другія, і таксама кінуліся ў бежанства.

Неабходная мадэрнізацыя ☞ 11

Водаправоды ў Гайнаўцы пракладаліся ў пасляваенны перыяд і патрабуюць мадэрнізацыі. У вадзе ўтрымліваецца большая чым прадбачваюць польскія нормы колькасць жалеза, марганцу і аміяку, таму ў Станцыі паляпшання якаснасці вады састаў вады даводзіцца да нормы. Аднак і Станцыі неабходная мадэрнізацыя.

Беларусь — беларусы

Ці ёсць ліха без дабра?

Адной з яскравых падзей грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў ліпені сталі змены, якія адбыліся ў найбуйнейшай грамадскай арганізацыі краіны — Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай (ФПБ). Здавалася, нічога надзвычайнага не адбылося — вышэйшыя прафсаюзныя актывісты пераабралі сабе старшыню. І стаў ім цяпер былы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Леанід Козік.

Зразумела, пытанне ў дадзеным выпадку тычыцца далёка не прозвішча новага старшыні, а той праблемы, якая абвастралася на працягу ўсёй паслявыбарнай сітуацыі вакол буйнейшага прафсаюзнага аб'яднання. Нагадаю, што былы старшыня ФПБ Уладзімір Ганчарык быў кандыдатам у прэзідэнты ад так званай аб'яднанай апазіцыі. Вынік усіх гэтых аб'яднаных намаганняў несуцяшальны для дэмакратаў Беларусі — Аляксандр Лукашэнка застаўся пры ўладзе, актывісты апазіцыйнага руху спазналі моцны палітычны ўціск і пераслед, вынікам якога стала апатыя грамадства да магчымасці якога-небудзь паляпшэння становішча з правамі і свабодамі чалавека ў краіне.

Можна доўга меркаваць, маглі перамагчы дэмакраты на леташніх прэзідэнцкіх выбарах ці не, але сам па сабе пройгрыш указвае на пралікі апазіцыянераў. Напэўна, галоўны з іх — спроба перамагчы не ўменнем, а колькасцю. Менавіта колькасць сяброў Федэрацыі (каля 4 млн. чалавек) была адным з козыраў групы падтрымкі Ганчарыка. На жаль, лічба гэтая аказалася, як кажуць, дутая. Прычына таго — у гісторыі ўзнікнення ФПБ. Бо яна ўтварылася з беларускай часткі колішніх прафсаюзаў усяго СССР, якія, як вядома, былі „школай камунізму". Доўгі час, каля 10-15 гадоў Федэрацыя была шчырым праваднікам ідэй адміністрацыі ў працоўныя масы. Таму, дарэчы, і пачалі ўзнікаць так званыя вольныя прафсаюзы, якія ў сваіх статутах запісвалі немагчымасць аб'яднання ў прафсаюзных шэрагах працадаўцаў і наёмных работнікаў. На жаль, улада, прынамсі, часцяком з прадстаўнікамі Федэрацыі стварала разнастайныя перашкоды ў дзейнасці новых прафсаюзных аб'яднанняў. Гэта ў нечым і стала прычынай невялікіх шэрагаў апошніх. Другім чыннікам было перайшоўшае з савецкіх часоў неразуменне большай часткай працуючага насельніцтва ролі прафесійных саюзаў у грамадстве. Людзі ў Беларусі ў сваёй большасці лічаць, што прафсаюзы — гэта структуры для нейкай грашовай кампенсацыі пуцёвак у адпачынак, дапамозе ў аздараўленні дзяцей і ў магчымым вырашэнні таму падобных сацыяльных пытанняў. Але самае галоўнае — усведамленне прафсаюзаў як нечага дадатковага да адміністрацыі, а не самастойных арганізацый, якія мусяць, перш за ўсё, выконваць ролю абаронцаў правоў працоўнага чалавека.

Магчыма, таму і атрымалася, што з 4 млн. сяброў, добра калі некалькі тысяч свядома і шчыра працавалі на перамогу свайго лідэра. Але большасць як шэрагоўцаў, так і кіруючага складу шчыра не разумела навошта прафсаюзам трэба лезці ў палітыку. Хаця Ганчарык абсалютна слушна і пераконваюча звязваў пагаршэнне людскога дабрабыту з палітыкай улады.

Пройгрыш у выбарах аказаўся вынікам выпрабавання Федэрацыі прафсаюзаў на права звацца сапраўднай арганізацыяй па абароне правоў працоўных. Прафсаюзныя чыноўнікі меншага разраду ніколі не імкнуліся па-сапраўднаму абараняць тых, на чые грошы, а дакладней складкі, яны жывуць. І таму калі пад ціскам улады з пасады кіраўніка ФПБ сышоў Ганчарык, ніякіх пратэстаў з прафсаюзных нізоў не было. Няма іх і зараз, калі ўжо выціснулі стаўшага на яго месца былога намесніка.

Новы старшыня Федэрацыі, як сведчаць яго калегі па працы ў Вярхоўным Савеце, ніколі не быў прыхільнікам незалежнасці Беларусі і дэмакратыі. І ўжо многія кажуць, што спроба рэфармаваць Федэрацыю прафсаюзаў у прафсаюзнае аб'яднанне класічнага тыпу пацярпела поўны крах. Яе новае кіраўніцтва будзе рэанімоўваць савецкія адносіны з уладай. Але, здаецца, няма ліха без дабра — шанц папаўнення шэрагаў вольных прафсаюзаў свядомымі сябрамі зараз самы лепшы.

Уладзімір Лапцэвіч

Падзяка

Праз рэдакцыю тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва" пераказваю вялікую падзяку цудоўным дзяўчатам і хлопцам з гурту „Прымакі" і яго кіраўніку Юрку Астапчуку за тыя прыгожыя хвіліны спаткання з творчасцю беларусаў Беласточчыны. У Трохградзе з захапленнем сустрэлі шчырыя і іскрыстыя песні ў выкананні „Прымакоў". Некалькі канцэртаў, у тым ліку ў старэйшым студэнцкім клубе Гданьска „Руды кот", дзе выступалі многія славутыя польскія артысты, далі вельмі добрыя водгукі аб беларускім гурце. Як прыклад можа сведчыць падзяка вядомага Польскага камернага хору „Schola Cantorum Gedanensis", гасцямі якога ўпершыню быў беларускі музычны ансамбль. У накіраваным мне лісце харысты напісалі, што выступленне рэкамендаваных мною „Прымакоў" было найбольш удалым з ліку ўсіх канцэртаў цыкла „Госці Польскага камернага хору" і спаткалася з вельмі гарачым прыёмам публікі. Адзначылі яны таксама, што канцэрт „Прымакоў" стварыў шанц набліжэння культуры Беларусі жыхарам Трохграда і прабываючым у Гданьску турыстам. У сувязі з гэтым пераказваю праз газету маю падзяку і падзяку Польскага камернага хору „Прымакам".

Міхал Аляксейчык
Генеральны консул Беларусі
ў Гданьску

Помнік Улашчыку



У музеі выяўленчага мастацтва, Фонд Анатоля Белага, у г. Старыя Дарогі пастаўлены новы помнік выдатнаму беларускаму гісторыку Міколу Улашчыку. Гэта другі помнік пастаўлены на працягу года і восьмы за час існавання музея. Помнік уяўляе сабой камень-волат з чырвонага фінскага граніту памерам 3 х 2 х 1,5 метраў, на якім замацаваны бронзавы барэльеф гісторыка, яго факсімільны надпіс „Мікола Улашчык" і шыльду з адмысловым тэкстам. Сам камень з'яўляецца помнікам прыроды і ўзяты пад ахову дзяржавы. Помнік Міколу Улашчыку стаіць побач з помнікам Ларысе Геніюш і гэта вельмі сімвалічна, бо гэта першыя ў Беларусі помнікі паліткатаржанам. Лёс гэтых выбітных людзей ва многім тоесны. Абое сядзелі за Беларусь. Улашчык чатыры разы, Ларыса Геніюш адзін раз, але сем гадоў. Пасля лагероў яны падтрымлівалі паміж сабой цесныя сяброўскія сувязі, сустракаліся, пастаянна ліставаліся. Гэтыя дзеячы з'яўляюцца сімвалам самаахвярнасці ў справе беззапаветнага служэння нашай Бацькаўшчыне, сімвалам цнатлівасці і маральнай чысціні. І нездарма на шыльдзе Міколы Улашчыка напісаны словы з яго любімага верша Ларысы Геніюш. „Як жыць — дык жыць для Беларусі. А без яе — зусім ня жыць". Лёс людзей увасобіўся ў лёсе іх помнікаў. Каля сямі гадоў помнік Ларысе Геніюш немагчыма паставіць на яе радзіме ў Зэльве. Улады адмаўляюць у такім праве беларусам ставіць помнікі сваім самым выбітным прадстаўнікам нацыі.

Тры гады праляжаў помнік Міколы Улашчыка ў Дзяржынскім райвыканкаме. Тры гады раздаваліся пастаянныя абяцанкі вырашыць праблему з устаноўкай помніка свайму знакамітаму земляку. Тым больш, што вялікіх сродкаў для ўстаноўкі помніка не патрабавалася, усё ўжо было прэзентавана клубам „Спадчына" і, нават, каб улагодзіць улады Дзяржынскага райвыканкама, на шыльдзе зрабілі адпаведны надпіс, што помнік ставіцца ўладамі Дзяржынска — „ад удзячных землякоў". Калі існуе тайнае распараджэнне — не ставіць помнікі рэпрэсаваным людзям, то і ўлады, як у Зэльве так і ў Дзяржынску, паводзяць сябе адпаведным чынам — рэпрэсуюцца і помнікі рэпрэсаваных. Гэта трэба ўсім нам зразумець, але не скарацца, бо ўседазволенасць і ўсеўладдзе ўлад безнадзейна прайшлі. Ужо помнікі можна ставіць і без іх высокага дазволу. Прыкладаў шмат — цэрквы, касцёлы, установы, прыватныя сядзібы, як, напрыклад, выяўленчы музей, Фонд Анатоля Белага. Не трэба з пагардай глядзець, што помнікі ставяцца на прыватных сядзібах, каля цэркваў і касцёлаў, на тэрыторыях іншых устаноў, не трэба да такіх помнікаў ставіцца як да другарадных. Гэтым часта грашаць многія „апантаныя, вольныя, незалежныя, дэмакратычныя журналісты". Трэба толькі радавацца і дзякаваць Богу, што такая мажлівасць з'явілася. Трэба яе як мага болей і лепей выкарыстоўваць. Лёс зноў звёў сумесна Міколу Улашчыка і Ларысу Геніюш — старых знаёмых і добрых сяброў, але звёў іх у метале на мілай іх сэрцу Бацькаўшчыне, няхай на Старадарожскай зямлі. Не будзем забываць, што як Мікола Улашчык, так і Ларыса Геніюш належаць усёй Беларусі, так і Старыя Дарогі — неад'емная тэрыторыя нашай роднай краіны.

Анатоль Белы

Астаемся Польшчай „Б"

[1 ☞ працяг]

грамадскім і гаспадарчым жыцці ды ў публічных справах, асабліва ў тых, якія іх кранаюць". І артыкул 16: **„Бакі адмовяцца ад сродкаў мяняючых прапорцыі насельніцтва на абшарах пражывання нацыянальных меншасцей, мэтай якіх было б абмежаванне правоў і свабод вынікаючых з прынцыпаў, акрэсленых у гэтай Агульнай канвенцыі."**

Нейкага зруху ў гэтай скандальнай справе цяжка, аднак, у бліжэйшы час спадзявацца. Канстытуцыйны трыбунал даследуе справы, як кажуць немцы *Langsam, langsam, aber sicher*, бо *паспех людзям на смех*. А калі б яшчэ давялося — у выпадку адмоўных вынікаў усіх унутрыдзяржаўных захадаў — звяртацца ў Раду Еўропы, дык і след сёлетніх самаўрадавых выбараў прастыне. Папраўка ў закон аб самаўрадавых выбарах, якая мае засцерагчы рассячэнне нацыянальных меншасцей, прынятая надоечы Сеймам па ініцыятыве Яўгена Чыквіна, задзейнічае, бадай, за чатыры гады.

Аляксандр Вярбіцкі

Спадару
Міхасю Андрасюку
шчырае спачуванне з прычыны напаткаўшага Яго гора —
смерці Бацькі
— выказваюць сябры Гайнаўскага аддзела
Беларускага саюза ў РП.

Галоўнаму рэдактару „Гайнаўскай панарамы"
Міхасю Андрасюку
словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора —
смерці Бацькі
— выказваюць сябры і гарадскія радныя
ад Беларускага народнага выбарчага камітэта.

Рок трымаецца моцна

Фестываль адкрыў Браян Скот — журналіст з Кракава, — які здымаў рэпартаж для праграмы „Этнічныя кліматы". Побач Тамаш Снарскі, вядучы Фестываль.

[1 ☞ працяг]

* * *

Усё добра, адно не разумею, чаму „Басовішча" пераўтварылася ў „Basowiszcza", пракрычаў мне пад сцэнай знаёмы ліцэіст. Такі менавіта надпіс красаваўся на плакатах і адмыслова да імпрэзы падрыхтаваных майках. Дарэчы, назву пераможцы фестывалю — „Partyzone" — немагчыма перадаць кірыліцай, каб не згубіць алюзій і да партызана, і да *party*, то-бок імпрэзы, і да зоны, што ў беларускім кантэксце гучыць страшнавата. Але ж арганізатары, рашаючы конкурс на плакат, не ведалі ні пераможцы, ні тым больш асацыяцый, якія выкліча яго назва. Падазраю таксама, што запіс лацінкай не на тое, каб спадабацца палякам, а хутчэй прызнанне нашай непісьменнасці ў кірыліцы. Гэта хутчэй за ўсё спроба паказаць, што беларуская мова, гэта не штосьці далёкае, запісанае невядомымі сённяшняй моладзі іерагліфамі, а зусім блізкае і зразумелае, што графічна можна перадаць знаёмымі літарамі. Як бы там ні было, я пагаджаюся з крытыкамі такой тэндэнцыі і асабіста буду бараніць кірыліцу да... апошняга „Басовішча". Добра, што хоць на сцэне красаваўся надпіс поўнасцю наш.

Многа крытыкі выклікала праца аховы. Сорак чалавек у зялёных бязрукаўках абвялі пляц перад сцэнай бела-чырвонай стужкай, прапускалі людзей праз форткі, дакладна іх абмацваючы. Нельга было пранесці не толькі небяспечнае шкло ці жалеза, але таксама амаль бясшкоднае піва ў пластмасавым кубку. Таму, як казалі арганізатары, што ўвайшоў у жыццё закон аб забароне спажывання алкаголю на масавых мерапрыемствах. Гэта крыху скрывіла першапачатковую ідэю свабоднай гульні, але што зробіш. Горш, што ахова з меншай пільнасцю сцерагла апаратуру. Першай ночы якісь дурань вырваў правады з гукарэжысёрскага пульта, а зараз потым заліў сам пульт вадою. Гэта скараціла канцэрт і мела ўплыў на другую ноч. Каб даць магчымасць выступіць тым, якія не паспелі з пятніцы на суботу, трэба было з суботы на нядзелю скарачаць выступленні іншых. Гэта не спадабалася ні гуртам, ні ўчадзелай ад музыкі публіцы.

Мікола Ваўранюк
Фота Рамана Васілюка

„Басовішча" ці „Basowiszcza"?

Музыка паганскай містыкі

Канец ліпеня мінуў пад знакам фестываляў: гарадоцкага „Басовішча" і віцебскага Славянскага базару. Назіраў я за імі збоку. На „Басовішча" я не езджу. Быў тры разы. Першы рас службова (як журналіст), але і з цікавасці да з'явы. Пасля ўжо толькі службова, і то ненадоўга. Гэта ад таго, што дагэтуль вірує мне ў вушах той тып музыкі, а ў вачах коламі ідуць багата аброслыя малойчыкі ў танцы *pogo*. Так, вось, сёлетняе „Басовішча" я глядзеў у тэлевізары і чытаў аб ім у друку. Можа быць, я пахіснуўся б і з намовы знаёмцаў паехаў у той Гарадок, калі б не аб'ява пра фестываль у адной з беластоцкіх газет. Так сказаць, чорнай магіяй для мяне была апісана характарыстыка стылю ці роду музыкі культываванай гуртамі, якія мелі там выступаць. Вось, іграюць яны і спяваюць *power metal, post grunge, punk-rock*. Не люблю я тае „звягі", але, больш-менш ведаю, што за гэтым скрываецца, *co jest tu grane*. Невядома мне, аднак, што значыць *nu metal*; ну, можа, ведаеце гэта вы? Адпаў я, аднак, калі прачытаў пра творы аднаго з гуртоў, што тамака ёсць „метал плюс паганская містыка і вераванні славян". І гэта асабліва для мяне ёсць тая чорная магія. Але добра, што „Басовішча" ёсць. Бо ж ёсць людзі, якія іграюць такую музыку і яе паклоннікі, нягледзячы на тое, што хаваецца пад таямнічымі акрэсленнямі журналістаў. Тым больш, што такую музыку неахвотна бачаць на эстрадах Беларусі, а для значнай часткі гуртоў, якія прыязджаюць з-за аддаленай на шматок кіламетраў мяжы, гэта адзін з нешматлікіх шанцаў прэзентацыі. Чаму? Бо гэты від музычнага мастацтва, а да таго палітычны водгалас, гэта для адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі фактычна чорная магія, паганства, і, цытуючы галоўнага героя шмат якіх гарадоцкіх песень — чужароднае цела ў кровазвароце Беларусі.

Так ці іначай, бліжэйшы мне від музыкі, прэзентаваны ў Віцебску. У апошнюю дэкаду ліпеня паказаліся тут песняры з краін СНД, прыбалтыйскіх і некалькіх еўрапейскіх, у асноўным былых сацыялістычных, такіх як Польшча, Румынія, Югаславія, Балгарыя. Была таксама прадстаўніца Мальты, невядома, чаму якраз яна. Мабыць, справа была ў падфарбаванні фестывалю крышынкай „паганскай містыкі", бы не хапала экзотыкі (з пункту гледжання заходніх еўрапейцаў) маладых песняроў з Казахстана ці Азербайджана. На жаль, Славянскі базар мяне расчараваў. Было, проста, нудотна. Часам аж санліва. Большасць выканаўцаў спрабавала спалучаць джаз, соул, рок з элементамі народнай музыкі, фолькам. Шмат каго, аднак, спалучала адно: пакройка штаноў — „званы", знізу больш ці менш распасцертыя.

Стаўлю піва таму, хто скажа мне, кім была ў Віцебску і як туды трапіла рэпрэзентантка Польшчы, нейкая Беата з Познані (не мыліць з Беатай Казідрак). Казалі, што быццам бы яна атрымала другую ўзнагароду на зялёнагурскім Фестывалі задзіночанай Еўропы (былы Фестываль савецкай песні). Выслухаў я яе ў пакутах. Асабліва паразіў мяне тэкст ейнай песні. Прыклад: *...w morzu zła, łodzie sztormu czas pcha, to miłość*. Вось дык лухта! Затое вялікае ўражанне ўчыніла на мне прадстаўніца гаспадароў — Аляксандра Кірсанава. Спявала толькі пад гітару. Стройная, даўганогая, даўгавалосая бландзінка, беларуска, у доўгай, расцятай у верхняй партыі сцёгнаў сукні, з беларускім арнаментам знізу, басанож, выканала старыя беларускія напевы, у сучаснай харызматычнай аранжыроўцы і з народнымі словамі „Ляцеў голуб". Кірсанава, аднак, не здабыла прызнання міжнароднага журы ў дзевяці асобах. Так як і мой фаварыт Андрыс Абелітэ. Песні гэтага прыгожага, стройнага латыша з моцным голасам не ўратавала ў ацэнцы журы нават ягонае сола на трубе. Дарэчы, іграў быў ёй аднойчы ў час канцэрта гурту „Scorpions". Затое сэрца членаў журы пакарыў югаслаў Зікі (атрымаў аж сем „дзесятак" і дзве „дзевяткі", значыць, ледзь не максімальную ацэнку). Несумненна, быў цікавы, можна было яго слухаць, але ж не паражаў. Не разумею, адкуль такі вердыкт. Але пра густы не дыскутуецца, асабліва на базары.

У Віцебску былі таксама зоркі. Сярод іх Лайма Вайкуле (здаецца, некаторыя жанчыны ўвогуле не старэюць). Пакрочыла па сцэне ў кампаніі трох стройных танцораў, у рытме адпаведным для песні „Танга, танга, танга". Даўжэйшы момант будавала настрой. Падняла мікрафон да вуснаў. І нічога. Толькі праз хвіліну яе характэрны голас дайшоў да слухачоў. Арганізацыйных агрэхаў у час віцебскага фестывалю было больш, нават калі не лічыць „успатыканняў" і бестактоўнасці вядучых, якія, на шчасце, хутка ўсё выпраўлялі. Незалежна ад узроўню Славянскага базару, думаю, што будзе ён працягвацца. Мае ён, менавіта, палітычны водгалас, як „Басовішча". Я ўжо быццам чую: „Што там якіясь Еўравізіі, не гаворачы пра «Басовішчы». У Віцебск з'язджаюцца людзі з шмат якіх краін, нават з Мальты прыязджаюць, а і Польшча ёсць, і Расія (так, як на фестывалях Еўравізіі). Не ўскрываюць паганска і містычна, як у Гарадку. У Беларусі ёсць свой міжнародны песенны фестываль". Толькі ці справа ў тым, каб толькі яго мець... Як кажа пагаворка: найлепей быць... Мецем.

Мацей Халадоўскі

Фэст у Міклашах...

У спякотны нядзельны поўдзень 14 ліпеня г.г. у Міклашах, што каля Орлі, на плошчы пры вясковым клубе адбыўся фэст арганізаваны ГП БГКТ супольна з Праўленнем гміны ў Орлі.

Фэст адкрыў войт гміны Ян Добаш. Прывітаў ён усіх прысутных, у тым ліку дастойных гасцей: падляшскага віцэ-ваяводу Ежы Паўяновіча з жонкай, консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандра Карачуна з сынамі, войта Чыжоўскай гміны Рыгора Мацкевіча, бурмістра Кляшчэляў Аляксандра Сяліцкага, старшыню ГП БГКТ Яна Сычэўскага, якому перадаў голас.

Старшыня БГКТ сцвердзіў, што гонарам Таварыства з'яўляецца ладжанне ў беларускім, асабліва ў вясковым асяроддзі, культурных мерапрыемстваў з удзелам мастацкіх калектываў з Рэспублікі Беларусь. Прывітаў ён ансамбль беларускай народнай музыкі і песні „Грымата" са Слоніма, пад мастацкім кіраўніцтвам Валянціны Пятрашкі і выклікаў на сцэну Валянціну Ласкевіч, якая павяла канцэрт. Выступілі эстрадны калектыў „Ас" з Беластока, хор з Маліннік пад кіраўніцтвам Веры Нічыпарук, Беларускі дзіцячы вакальна-танцавальны калектыў, якім займаецца сужонства Людміла і Мікалай Фадзіны. З сатырычным вершам выступіў Андрэй Грайко з Пашкоўшчыны, якога тут называюць „народным паэтам Арлянскай гміны". З поспехам выступілі дуэт Люба Гаўрылюк і Уладзімір Іванюк, хор „Арляне" з Орлі, хор БГКТ „Крыніца" з Беластока пад кіраўніцтвам Віктара Маланчыка і эстрадны калектыў „Лідэр" з Беластока.

Трэба сцвердзіць, што над усімі выступаючымі дамінавалі госці — ансамбль „Грымата" са Слоніма, які тры разы выходзіў на эстраду.

... і ў Старым Беразове

На падрыхтаванай сялянамі эстрадзе ў 17 гадзін паявілася надта тут папулярная войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч, сардэчна прывітала ў першую чаргу запрошаных гасцей: падляшскага віцэ-ваяводу Ежы Паўяновіча з жонкай, войтаў суседніх гмін: Чыжоўскай — Рыгора Мацкевіча і Дубіцкай — Анатоля Паўлоўскага, бурмістра Кляшчэляў Аляксандра Сяліцкага, павятовага каменданта паліцыі ў Гайнаўцы Анджэя Панюркевіча, праваслаўных святароў з Чыжоў а. Іаана Раманчука і з Ласінкі а. Георгія Коса, старшыню ГП БГКТ Яна Сычэўскага.

Старшыня Таварыства падзякаваў Вользе Рыгаровіч за падрыхтоўку фэсту і даверыў Валянціне Ласкевіч вядзенне канцэртнай праграмы. Выступілі, пераехаўшыя з Міклашоў, калектывы: „Лідэр" з Беластока, дуэт Люба Гаўрылюк і Уладзімір Іванюк, хор БГКТ „Крыніца" з Беластока, а таксама хор „Арэшкі" з Арэшкава і беларускі маладзёжны мастацкі калектыў з Дубіноў, якім кіруе Пётр Скепка.

Так як і ў Міклашах, у Старым Беразове вялікім поспехам карыстаўся ансамбль „Грымата" са Слоніма.

На заканчэнне фэсту дэманстраваліся цікавыя спосабы барацьбы ў выкананні дзюдаістаў са Спартыўнага клуба „Пушча" ў Гайнаўцы, трэнерам якога з'яўляецца Якуб Астапчук з Гарадка.

Віктар Швед

Распачалося жніво

Камбайн „Бізон" Яна Ляшкевіча працуе салідна з 1987 года.

Едучы ў Чыжы бачу гаспадара, які з прычэпамі чакае камбайна. Стаіць душнае надвор'е. На палях працуюць польскія „Бізоны", купленыя яшчэ ў васьмідзесятыя гады і паходжаныя нямецкія „Клясы". У Чыжах пуста. Каля магазіна бачу групу мужчын, відаць, аматараў піва. На некаторых панадворках гаспадары корпаюцца каля трактароў або машын. З канца вёскі выязджае камбайн, а за ім трактар з вялікай прычэпай для збожжа. Адчуваецца, што ў вёсцы самай важнай стала ўборка збожжа. Жыхары Чыжоў, якія асноўны прыбытак атрымоўваюць ад продажу збожжа, вырошчванага на пшанічна-бурачаных землях, клапоцяцца за высокі плён. І сапраўды ён бывае тут нават удвая большы, чым на пясчаных землях каля Дубіч-Царкоўных ці Кляшчэляў. Ад колькасці сабранага збожжа, а пасля ўдалага продажу будзе залежаць бліжэйшая будучыня гаспадароў.

Спыняюся каля мужчыны, які корпаецца ля старога трактара з вялікай прычэпай, абложанай зверху дошкамі.

— Ужо павінен быў прыехаць камбайн, але, відаць, яшчэ працуе на суседнім полі. Зараз трактарам заняўся, каб не стаяць без працы, — тлумачыць Якуб Астапчук з Чыжоў. Ужо ўчора камбайны выйшлі на поле. Пшаніцу хачу жаць і чакаю, што прыедзе дапамога. Жонка на „камурку" сыну тэлефанавала, бо я ў гэтых тэлефонах не разбіраюся.

Дзядзька Якуб перапісаў поле на сына, які жыве ў Гайнаўцы, і чакае ягонага прыезду.

Пад'язджае да нас жанчына на веласіпедзе.

— А вы можа купляеце збожжа, — звяртаецца да мяне Люба Сапяжынская са Збуча. Вяртаецца яна дамоў ад лекара. Два дні раней карова ўдарыла яе ў руку і тая апухла і пачарнела. Лекар накіраваў жанчыну ў Гайнаўку да спецыяліста.

— Мы ўчора малацілі жыта і пшаніцу. Сёння камбайн сапсаваўся. Нейкі ланцуг лопнуў, — тлумачыць пані Люба.

Мае суразмоўцы расказваюць пра Яўгена Заброцкага са Збуча, у якога звыш 100 гектараў зямлі і які наймае на працу работнікаў. Сёння за збожжам прыехала да яго грузавая машына. Паехала на поле, каб адразу з-пад камбайна забраць зерне.

— У такіх як я, то галава ўжо замалая. Маладыя ведаюць лепш як сеяць, як апырскваць ад шкоднікаў, то і плёны вялікія ў іх, — дабаўляе спадар Астапчук.

Два кіламетры далей каля дарогі стаіць трактар з прычэпай поўнай збожжа. Збоку камбайн малоціць пшаніцу. Хаця яна невялічкая, то на твары гаспадара не відаць асаблівага смутку.

— Учора жаў я пшаніцу, то 4 тоны з гектара будзе, а павінна быць шэсць, — тлумачыць Якуб Міхалюк са Збуча.

Знаходзімся на полі сваяка майго суразмоўцы. У Збучы людзі памагаюць сабе ў час жніва. Дапамога патрэбная асабліва тады, калі пойдуць праліўныя дажджы і мала часу застаецца на малацьбу.

Ян Ляшкевіч з Дубіч-Асочных сядзіць на камбайне і назірае, каб збожжа высыпалася ў прычэп грузавой машыны. Ягоны брат Васіль Ляшкевіч і зяць хутка разгортваюць жыта па прычэпе.

— Збожжа ўжо спелае і сухое. Можа яшчэ крыху пасырэць, калі разам з зеленаватымі сцёбламі перакрунецца ў камбайне, — паясняе Васіль Ляшкевіч.

У жніво супрацоўнічае ён з братам, каб хутчэй змалаціць збожжа і адвезці яго ў падрыхтаваныя ў гаспадарчых будынках склады.

Перад элеватарамі каля Бельска-Падляшскага часта ўзнікаюць чэргі і трэба доўга чакаць, каб прадаць пшаніцу ці жыта ў гарачы момант. А, на жаль, у мінулых гадах было гэта адзінае месца ў наваколлі, дзе куплялі збожжа з дзяржаўнай даплатай.

Васіль Ляшкевіч кажа, што ўжо праз некалькі дзён пачнуць купляць збожжа. Аднак, не ведае ён колькі будуць плаціць за пшаніцу ці жыта і цяжка яму сказаць, які атрымаецца даход. Суразмоўца хутка садзіцца ў грузавую машыну і едзе ў напрамку камбайна прыняць зерне. На полі пакідаю людзей, якія клапоцяцца, каб паспець з добрым надвор'ем закончыць жніво.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

У Якуба Астапчука і Любы Сапяжынскай ужо распачаліся жніўныя работы.

Таннее стратэгічны прадукт

Калі ў Польшчы мяняліся цэны, якія вызначаліся дзяржаўнай адміністрацыяй, найчасцей абазначала гэта рух толькі ў адным напрамку — іх павышэння. Кожнае паведамленне пра новыя цэны электраэнергіі, газу, вады, тэлекамунікацыйных паслуг інфармавала, што ўзрастаюць яны на адпаведны працэнт і што грамадзяне не павінны па гэтай прычыне адчуваць сябе надта пакрыўджанымі, таму што абазначае гэта вышэйшы выдатак толькі на пару злотых. На практыцы выдатак вырастаў на дзесяткі злотых. Манапалістычныя фірмы, якімі распараджаюцца палітычныя кланы, могуць прымушаць грамадзян плаціць больш чым у багацейшых краінах свету — Нямеччыне, Італіі, Францыі. Электраэнергіі, газу, бензіну ці вады немагчыма купіць на рынку так як сала ці буракоў.

Ёсць аднак стратэгічны прадукт, на які дзяржаўныя ўлады плануюць ад новага года панізіць цану. Ідзе пра спіртныя вырабы, продаж якіх заўсёды прыносіў бюджэту вялікі прыбытак. Апошнім часам попыт рынку на прадукты краёвых спіртзаводаў паменшыўся так радыкальна, што замест спадзяванага ў 2001 г. прыбытку велічынёю ў 5 мільярдаў злотых, у бюджэт трапіла толькі 4 млрд. Не абазначае гэта, што ў Польшчы паменшылася колькасць аматараў спіртных напояў. Рынак прапануе вялікі выбар гэтага прадукту з неафіцыйных, забароненых крыніц, але нашмат таннейшага. Таму мала хто купляе прадукты дзяржаўнага *Polmosu*. Яшчэ ніколі не было так, што вытворцам спірту пагражала банкруцтва. Сёння гэта стала рэальным.

Варта прыгадаць, што кошт прадукцыі аднае бутэлькі гарэлкі складае 1,80 зл., падатак — звыш 18 зл. (81 працэнт цаны) і каля 3 зл. — прыбытак прадаўцоў. Плаціць так вялікія падаткі могуць толькі багатыя людзі, бяднейшыя аматары найбольш папулярнага напітку, які спадарожнічае ўсім святкаванням і сяброўскім сустрэчам, вымушаны шукаць таннейшых крыніц яго продажу.

Канкурэнтныя, нелегальныя крыніцы пастаўкі спіртных напояў на рынак гэта, між іншым, кантрабанда. Гандляры з Гродна, якіх поўна на беластоцкіх базарах, з'яўляюцца аднак толькі дробнай групкай пастаўшчыкоў алкаголю на польскі рынак. Калі ў Беларусі бутэлька гарэлкі ў 5-6 разоў таннейшая чым у Польшчы, таму лагічным ёсць існаванне кантрабанды. Пару тысяч людзей з Гродзеншчыны і Брэстчыны жыве толькі з гандлю алкаголем, вядучы пастаяннае змаганне з польскімі мытнымі службамі. Большасць штодзённа перасякае мяжу з 2-3 бутлямі алкаголю, атрымліваючы ад такога гандлю 5-6 долараў чыстага прыбытку. Яшчэ большы прыбытак атрымаецца ад алкаголю, купленага на мяжы, дзе літровая бутля папулярнай гарэлкі *Ельцын* ці каньяку *Напалеон* каштуе два долары. Падобная структура цэн выступае на ўкраінска-польскай мяжы. На ўсходзе аднак гандаль абмяжоўваюць кашмарныя ўмовы перасякання мяжы. Такіх праблем няма на поўдні. У Славакіі і Чэхіі цана бутэлькі гарэлкі вагаецца ад 8 да 9 злотых. Мяжа з гэтымі дзяржавамі амаль адкрытая. Жыхары памежных мясцовасцей перасякаюць яе амаль штодзённа. На чэшскім і славацкім баку, пару дзесяткаў метраў за пастарункамі пагранічнікаў, шмат крамаў з вялікім выбарам якаснай гарэлкі. Нічога затым дзіўнага, што ў некаторых памежных гмінах прадукты айчыннай вытворчасці ў крамах амаль не разыходзяцца.

Дробныя пастаўшчыкі, якія за пазухай пераносяць па 2-3 бутэлькі, гэта толькі маргіналіі сапраўднай кантрабанды. Мільёны літраў спірту кожны год прывозяць нелегальна ўсялякія мафіёзныя групы. Купляюць яны спірт у Нямеччыне, а ў Польшчы — пячаткі ад карумпаваных чыноўнікаў пад дакументамі аб адпраўцы тавару на ўсход. Такім чынам у крамах — лічаць эксперты — прадаецца можа нават палова алкаголю з імпарту, пералітага ў польскія бутэлькі з адпаведнымі акцызнымі знакамі.

Хаця паліцыя нішчыць чарговыя лясныя фабрыкі спірту каля Гарадка, Саколкі ці Чорнай-Беластоцкай, аднак зараз жа ўзнікаюць новыя. Перспектыва вялікага прыбытку заахвочвае да рызыкі. Удасканалілася таксама структура продажу самагонкі. Цяпер амаль у кожнай вёсцы можна набыць прадукты з гарадоцкіх ці сакольскіх лясоў. Гандлёвыя прадстаўніцтвы лясных фабрык працуюць вельмі прафесійна. Канкурэнцыя прымушае таксама дбаць пра якаснасць. Можна набыць прадукты з водарам мяты, дубовай кары, ядлоўцу.

Падпольны гандаль алкаголем адкрыў абсурднасць дзяржаўнай палітыкі. Павышэнне падаткаў — аказалася — не прыносіць прыбытку ў бюджэт, а наадварот, яго абмежаванне. Таму ад некалькіх тыдняў з Міністэрства фінансаў плывуць сігналы, што абавязкова трэба панізіць падаткі, а гэтым самым цану краёвых спіртных напояў. Плануецца нават, што ад 1 студзеня 2003 г. гарэлка стане таннейшай на 30 працэнтаў. На практыцы будзе гэта абазначаць, што цана паўлітра найбольш папулярнай гарэлкі складзе 16-17 злотых. Гэта хаця нашмат больш чым на базарах, але адкрывае грамадзянам Польшчы магчымасць купляць больш бяспечны алкаголь. Больш натуральна павінен тады гучаць традыцыйны тост: „На здароўе", чым з кілішкам напоўненым неакрэсленай вадкасцю, якая пахне пакрысе спіртам, бензінам ды недамытым кантрабандыстам.

Яўген Міранові ч

Літаратурна-мастацкая старонка (508)

Віктар Швед

Колькі нас?

Жывем мы ў неспакойны час,
Быў перапіс тут пад прымусам.
Пытанне мучыць: колькі нас,
Колькі жывых тут беларусаў?

Колькі ёсць сярод нас такіх,
Што беларускасці апорай?
А колькі нам ужо чужых,
Што расплыліся ў польскім моры?

Палякі скажуць: — Вас няма,
Тут аднародная краіна,
Турбуецеся вы дарма,
Люд беларускі ўжо загінуў.

Скажы, тутэйшы беларус,
А пад якім цяпер ты знакам?
Пойдзем мо ўжо ў Еўрасаюз
Як праваслаўныя палякі?

З трактарам заручаны

Дарагому Пятру

Брат з добрай волі, не з прымусу,
Поўны жыццёвых юных мар,
Прыехаў з Урсуса „Урсусам",
Як трактарыст і гаспадар.

Бацькоўскія палеткі ў Моры
Ажно да старасці сівой
Ён верным скалясіў маторам
І кволай сілаю сваёй.

Браток мой, як пчаліны лекар,
Лечыць, як можа, свой матор,
Таму і служыць ён паўвеку
І аніразу не памёр.

У цяжкім побыце вясковым
Брат з трактарам злучыў жыццё.
І з трактарам адначасова
Пойдуць, мабыць, у небыццё.

Юбілейнае

Алене Анішэўскай

У маляўнічай Белавежы
Пачаўся Твой жыццёвы шлях.
Ты сэрцам да яе належыш
Наяве а таксама ў снах.

У час ваенны ў Беластоку,
Сярод натхняючых сяброў,
Лавіла сэрцам ты глыбока
Да свайго роднага любоў.

І гэтай вернае любові,
І сэрцабольнага чуцця
Так многа ў паэтычным слове
Тваім і ў побыце жыцця.

Натхняйся, дарагая Лена,
У белавежскае цішы!
Пакуль надыдзе наша змена —
Ты ўсё пішы, пішы, пішы!

Сумная восень

Пазваніў я ў Мора
Да сястрыцы Ніны.
„Ніна ляжыць хворай" —
Чую праз хвіліну.

Адазваўся швагер
Сумненька, ціхенька:
„Чуюся я блага,
Надта ўжо слабенькі.

Дзянёчкі і ночкі
Стаюцца цяжарам,
Падапёр кіёчкам
Я кволую старасць".

Сумуе няспынна
Хаціна старая.
Тут Васіль і Ніна
Век свой дажываюць.

Пярына

Агата злосна тупала па размяклым снезе. Адзін крок наперад — паўкроку назад! Пранізлівы вецер біў ёй у змакрэлы твар. Расшпіліла куртку, рассупоніла шалік. Яшчэ бракавала, прастыне! Да таго ўсяго — легчы ў ложак! А, можа, і добра было б, адляжацца, адхварэць. Напіцца ліпавай гарбаты, наесціся аспірыну, нацерціся ды добра выпацець у пасцелі. Ва ўласным ложку, пад пухавай пярынай. Тую пярыну, што ёй бабуля падарыла, звычайна ненавідзела. Хто сёння накрываецца гусіным пухам! Ці ў горадзе, ці ў вёсцы. Несучасна, казала бабе Веры Агата, лягаць пад пярыну. Бабка паглядзела на ўнучку, якая ўжо ў гады ўбілася, у старыя дзеўкі хоць яе запісвай: „Не важна, пад што, а з кім!" Мабыць, і замовіла штосьці з тою пасцеллю, ці што зашыла ў пёры, бо з таго моманту Агаце ад кавалераў адбою не было. Ды што за кавалеры! Без хаты, без зарплаты... Адно толькі ім у галаве, каб пад тую пярыну ўскочыць.

А пасля хоць ты на сцяну лезь. Не звоніць, не прыходзіць, не праводзіць... І хата ў Агаты свая, і ўежна ды ўпітна, а хоць ты забіся. Толькі ў сэрца які залезе, знікае, бы той растаптаны снег. Толькі брудная пляма застаецца. Вось і сёння — прыйшла ў кавярню „Піўныя слёзы", а Сіман Берг са сваёю студэнткай піва п'юць. Кінуў „хэлёў", і нават не гляне. Лупіцца толькі на тую дзявоху, бы пракаўкнуць намерваўся. Бо ёсць на што глядзець. А пра Канта гутарку вядзе, з тою крэцінкай. А што там у тае дурніцы — адны цыцкі нумар шэсць. Бы там інтэлект яна мела нейкі. Гад паганы, тыдзень не званіў. Шукала яго Агата па ўсіх піўбарах, бы там ёсць месца для такога навукоўца. Сядзеў бы дома, жонку, дзетак пільнаваў, не са студэнткамі піва піць такому!

Не, пакуль у пусты дом, з якога змылася Агаціна сястра ў нанятую „кавалерку", зайсці трэба яшчэ ў мастацкую кавярню. Там хоць артысты, пісакі садавяцца. Агата тыдзень таму паказала свае літаратурныя спробы самаму рэдактару Герману Сюзіну. Ён, распытаўшы, што робіць яна сакратаркай у школе, ухмыльнуўся толькі, але ўзяў Агацін сшытачак дахаты, пачытаць. Ён такіх лістоў, пакропленых слязьмі, мае поўную чорную торбу, кожнаму пачаткоўцу абяцае пазнаёміцца з творамі. Сам Сюзін піша мала і рэдка, але рашае пра літаратурнае жыццё ўсяго места. А сядзеў з ім тады, як заўсёды злосна надзьмуўшы свае румяныя шчокі, рэдактар Зыгмунт Брысь. Брысь, чорны гумарыст, выцягнуў жменю цыгарэт з яе пачка. Агата сыкнула: „Чаго? Пытаўся?" Брысь гыркнуў: „Ты, сука худая!" Уся ў слязах, ледзь дапіла свае сухое чырвонае віно. Бегла, паўсляпая ад злосці і жалю, на аўтобус. У той вечар сустрэла яе яшчэ адна крыўда. За язду зайцам фунданулі ёй штраф.

Сёння ў кавярні „Змрочныя мроі" пілі піва ўсе важныя літаратурныя персоны. Пазваў Агату да запаветнага століка сам Брысь. І паказаў пальцам: „Гэта мая дзяўчына Агатка". А пасля раскрыліў сшытачак, атрыманы ад Германа, азагалоўлены „Мой сон нясонны". „Я ў шоку, — дадаў. — Мне твае сны нясонныя сніліся". І раскашляўся. Браў яго грып.

У гэту ноч Зыгмунта накрыла славутая пярына. І сон нясонны сніўся ім дваім. І стаўся цуд. Брысь не знік. А на твар заблукала яму ўсмешка, якое публіка не бачыла даўно. І верш Зыгмунту Брысю напісаўся. Не трагічна-гумарыстычны, а ўва ўсенькім лірычны.

Міра Лукша

Электрычны бусел

Тэатр пачынаецца з вешалкі, паэзія з рытмікі, а нас бусел прынёс. Бусел прынёс нас, ластаўка — вясну, а ў канікульнае лета Георгій Валкавыцкі выпусціў з-пад свайго пяра новую кніжку*. Чытачам „Нівы" яна можа здацца незусім новай, бо шмат што з яе зместу было ўжо на нашых старонках. Але ёсць і папаўненні.

Гісторык — прафесійны скажальнік фактаў — аўтар часта адклікаецца да гісторыі, не толькі навейшай. *Жыццяпіс — апісанне найлепшых бакоў свайго жыцця.* У кнігу ўвайшлі насамперш аўтабіяграфічныя нарысы; аўтар спярша знаёміць крыху з сабою. Сваю хату стаўляе, аднак, скраю, а вакол цэнтральнага кантаслупа развешвае лялькі вядомых нам персанажаў — большых і меншых багоў і бажкоў нашай тутай, тутэйшай і найтутэйшай камедыі.

Бадай найвышэй на свой Алімп Георгій Валкавыцкі саджае белавежскіх багоў: Вялікага Барыса, Вялікага Станіслава і ... заміж у пячэрскія скіты падаецца ў Найяснейшую Палянку. Апрача Леха, Руса і Шушкевіча ў ваколбелавежскім пантэоне маем і Горбі, і Бузука, і іншых ідалаў. Ёсць таксама любімцы багоў і багінь — Барскі з Клінтанам, ёсць і процьма вядомых прарокаў са шкельцамі і без.

Фота Міры Лукшы

Валкавыцкі, аднак, не моліцца ў іх адрас, але хітрасплетніцка брукуе іхнія агародчыкі або дамалёўвае ім то капыты, то хвасты, то рогі. І так неяк выходзіць, што тыя дамалёўкі сістэматызаваны, начэплены ў адно месца.

Эх, каб уставіць людзям у мазгі, замест першабытных звілін, электронныя! — разважаў у доўгія бельведэрскія ночы Вялікі Электрык. — Ведаў бы, аб чым народ думае. Падкепліваючы з розных лідэраў Георгій Валкавыцкі шырокім німбам абыходзіць затое Лукашэнку. Гэта не толькі цацавітая павага Бацьку, бо абодва з таго самага індактрынафонду: *Надавішь кнопку — чик-чи-рик — и человек готов!*; такі бусел. Аўтар — за амерыканскімі вучонымі — прагназіруе неўміручасць на 2020-2030-я гады. Неяк не заўважае, што ўжо стагоддзем раней іншыя вучоныя ў адносінах да Вялікага Электрыфікатара (*Коммунизм — это есть Советская власть плюс электрификация всей страны*) паспяхова прымянілі і бальзамаванне, і „чыпы" з *кнопкай*. Заключнае прароцтва *І мяне там не будзе* — памылковае: ужо амаль няма, але быў, ёсць і будзе! *Абсурд — рухаючая сіла прыроды...*

Апошні экскурс з'яўляецца толькі ашчэпкам у цікава распланаваны і дбайна дагледжаны агародчык, у якім і ружы, і перцу крыху. Новую кніжку Георгія Валкавыцкага варта чытаць і перачытваць — не толькі з-за прысутнасці там неардынарных думак і апісанняў добра нам вядомых персанажаў — мы ж любім заглядаць за заслоны менш-больш асабістага жыцця нашых не толькі віртуальных знаёмых. Асабліва ж варта насалоджвацца багатай і вельмі змястоўнай мовай аўтара, бо гэты скарб становіцца ў наш час штораз больш адзінокім рарытэтам.

Аляксандр Вярбіцкі

*Георгій Валкавыцкі, *Ашчэпкі*, Беласток 2002.

Зорка

старонка для дзяцей

Гурт „Рамонкі” з Ласінкі. Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вершы Віктара Шведа

Чатыры стыхіі

Просіць настаўніца Марыю:
— Чатыры назаві стыхіі.
— Агонь, зямля, ну і паветра,
І яшчэ нешта ў зямлі нетрах...

— Ты блізка гэтага, Марыя,
Чым жа ты штодзень рукі мыеш?
— Ды гэта ж хіба будзе мыла, —
Марыя раптам падхапіла.

Навошта Бог даў ногі?

Запытаў сын татку дарагога:
— Ці магу ўзяць з гаража машыну?
— А навошта Бог даў табе ногі? —
Адказаў на гэта бацька сыну.

— Мае ногі, каб ты ведаў тата,
Мне патрэбныя цяпер ужо як норма:
Вось адна з іх на акселератар,
А другая, вядома, на тормаз.

Ігар СІДАРУК

Парашутыст

Купалы — у небе чыстым...

— Буду я
Парашутыстам! —
Радасны, крычыць Алесь
І аж свеціцца увесь.

— Каб з крыла саскочыць лоўка,
Неабходна
Трэніроўка! —
Заўважае сыну тата,
Дзьмухавец ірве прымяты
І як дзьмухне
— Не зявай!
Ну, Алесік, даганяй!

А яшчэ праз дзве хвілінкі
Неслі хлопчыка пушынкі
Дзьмухаўца па небе чыстым...

Будзе ён парашутыстам!

КОНКУРС – КЛАСІКІ

Рэдакцыя „Зоркі” хоча адзначыць 120 гадавіну з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мы прапануем нашым чытачам шэраг конкурсаў. Мэта конкурсу адукацыйная.

Задачай чытача — выбраць правільныя адказы.

Аўтары правільных адказаў выйграюць беларускія кніжкі.

1. Янка Купала нарадзіўся ў:
а) Вільні,
б) Вязынцы,
в) Воранаве.

2. Якуб Колас напісаў паэму:
а) „Новая зямля”,
б) „Новая дарога”,
в) „Новы горад”.

3. На якой мове напісаў першыя творы Янка Купала?
а) на польскай,
б) на рускай,
в) на літоўскай.

Адказ на Конкурс-Класікі ў „Зорцы” н-р 18:

1. Сапраўднае прозвішча Якуба Коласа — Кастусь Міцкевіч,
2. Янка Купала нарадзіўся ў шляхецкай сям'і,
3. Янка Купала мае сваю вуліцу ў Беластоку.

Кніжку Уладзіміра Арлова „Адкуль наш род” выйграў **Рафал Сельвясюк** з гімназіі ў Орлі.

ЗОРКА

„Рамонкі” з Ласінкі

У час першага экуменічнага фестывалю, які сёлета адбыўся ў Беластоку, выступіў гурт „Рамонкі”. „Рамонкі” гэта колішнія „Лісічкі” з Ласінкі. Яны заспявалі некалькі рэлігійных песень са свайго рэпертуару. Публіка была пад уражаннем, „Рамонкі” атрымалі буру апладысментаў.

У калектыве памянялася дырыжорка, зараз з дзецьмі працуе новая псаломшчыца з парафіі Ласінка. Яна прыехала з Украіны. Разам са зменай вядучай — „Лісічкі” памяняліся на „Рамонкі”. Гурт захаваў свой ранейшы стыль і высокі ўзровень выканання. Спяваюць у ім тыя ж самыя дзеці і моладзь. Канцэрт у выканнані „Рамонкаў” прыносіць духовую радасць.

ЗОРКА

Нявеста трох жаніхоў

(іспанская казка)

Жыў чалавек. А ў яго была дачка. Дзяўчына была прывабная, як сонца, але свавольнага нораву, як горны вецер.

Аднойчы бацька працаваў у садзе. Адчыніліся весніцы, і тры юнакі, адзін за аднаго прыгажэйшы, зайшлі ў сад і сказалі:

— Твая дачка цудоўная, як сонца. Мы просім яе рукі.

Бацька адказаў:

— Яна свавольная, як вецер. Трэба спытаць у яе згоды. — І схаваўся ў доме, а юнакі засталіся чакаць каля весніц.

Бацька прыйшоў да дачкі і сказаў:

— Тры юнакі, адзін за аднаго прыгажэйшы, просяць тваёй рукі. Каго ж з трох назавеш ты сваім мужам?

Дачка паглядзела ў акенца і ўбачыла, што бацька сказаў праўду: такіх прыгажуноў яна яшчэ не сустракала!

Усміхнуўшыся, адказала:

— Усе трое мне даспадобы.

Бацька раззлаваўся:

— Ты ж не можаш выйсці замуж за трох?

— Згодна выйсці за любога з іх, — адказала дачка. — Але зразумей, мне патрэбны ўсе трое.

І колькі бацька ні спрачаўся, паўтарала адно і тое ж:

— Зразумей, мне патрэбны ўсе трое!

Няшчасны стары не ведаў, што адказаць юнакам. Ён доўга думаў, нарэшце выйшаў і сказаў жаніхам:

— Мая дачка прывабная, як сонца, але свавольная, як горны вецер: ёй патрэбны ўсе трое! Але ж не можа яна выйсці замуж за траіх. Паслухайце маю параду: адпраўляйцеся ў чужыя землі і далёкія краіны — шукайце там сваё шчасце.

Юнакі пераглянуліся.

Бацька растлумачыў:

— Шукайце ў далёкіх краінах для сваёй нявесты самы лепшы, самы рэдкі падарунак, якога няма нідзе на свеце. І той, хто знойдзе яго, стане мужам маёй дачкі.

Жаніхі моўчкі пакланіліся і выйшлі.

У той жа дзень яны пакінулі берагі Іспаніі і адправіліся ў чужыя землі і далёкія краіны на пошукі свайго шчасця. Кожны ехаў сваім шляхам, але ніводзін не знайшоў для нявесты падарунка, якога няма нідзе на свеце. Доўга блукалі яны па бурных морах, не адну пару туфляў парвалі аб вострыя камяні, ходзячы па чужых дарогах. Смутак ахінуў іх сэрцы, але не пазбавіў надзеі.

І вось аднойчы першы жаніх спаткаў нямоглага старога.

— Добры дзень, юнак, — прашаптаў вандроўнік, — ці не хочаш ты купіць люстэрка?

Люстэрка было маленькае, і юнак, горка засмяяўшыся, адказаў:

Дзяўчаты з Кляшчэляў. Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Альжбета Каршак, вучаніца II класа ПШ у Храбалах, лаўрэатка II месца — верш Андрэя Аляксандрава „Лясная казка". Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Анеля Мартынюк, вучаніца III класа Гімназіі ў Орлі — верш Віктара Шведа „Званы Хатыні". Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вясёлы куточак

— Мамачка, — просіць малы Янка, — выкраслі з майго пісьма Дзеду Марозу чорную электрычку, а на яе месца выпішы веласіпед.

— Не хочаш ужо чыгункі?

— Хачу, але сёння знайшоў яе ў шафе.

* * *

У лекара:

— Пан доктар, мой сынок вельмі кашляе.

— Запішу яму добры сіроп. Давайце яму кожны дзень па сем чайных лыжачак.

— Гэта немагчыма!

— Чаму?

— Бо ў нашай кухні маем толькі шэсць такіх лыжачак.

* * *

Янка вяртаецца дадому з пасведчаннем заканчэння школьнага года.

— Пакажы мне сваё пасведчанне, — просіць бацька.

— Што там пасведчанне! Найважнейшае, каб здароўе было.

* * *

Мішка вяртаецца дадому са школьным пасведчаннем:

— Татка, — крычыць ужо ад парога, — маю вам добрую навіну! Мой кантракт з шостым класам школа прадоўжыла на чарговы год.

* * *

На ўроку фізкультуры настаўнік загадаў вучням легчы на плечы і круціць нагамі быццам едучы веласіпедам.

— А ты, Янка, чаму не круціш? — пытае аднаго з вучняў.

— Бо я цяпер з'язджаю з горкі.

* * *

— Сыночку! — папракае мама, — хто ж гэта бачыў, каб так чытаць кніжку. Чаму ты прапускаеш кожную другую старонку?

— Бо гэта кніжка пра шпіёнаў і я хачу як найхутчэй іх раскрыць.

* * *

— Татка, адгадай: якая чыгунка найбольш спазняецца?

— Не ведаю.

— Тая, якую ты мне абяцаў пад мінулагоднюю ёлку.

Даслаў Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Міра ЛУКША

Рабое Сонейка

Проста Сонцу ў вочы
Не зіркай,
У яго твар пякучы.
Акуляры надзявай,
Хавайся ў цянёчак.
Глянь праз дымленае шкло —
Здзівішся бясконца:
Сонца ў вяснушках усё,
Як і ты ад сонца.

— Такое люстэрка мне не патрэбна. Я шукаю для нявесты падарунак, якога няма нідзе на свеце.

Стары ўсміхнуўся:

— Ты знайшоў яго, сынок. Гэтае люстэрка не простае: у любую хвіліну ты можаш убачыць у ім таго, каго пажадаеш.

Юнак вельмі зарадаваўся, узяў люстэрка і аддаў за яго старому ўсе свае грошы.

Неўзабаве другі жаніх сустрэўся з тым жа вандроўнікам.

— Ці не патрэбная табе бутэлечка з бальзамам? — спытаў вандроўнік.

— Мне бальзам без патрэбы, — адказаў юнак. — Я шукаю для нявесты падарунак, якога няма нідзе на свеце.

Аднак і бальзам быў не просты, а чарадзейны. Вандроўнік растлумачыў юнаку, што гэтым бальзамам можна не толькі загойваць раны, але і ажыўляць мёртвых. Абрадаваны юнак узяў бутэлечку з бальзамам і аддаў за яго вандроўніку ўсе свае грошы.

(працяг будзе)

Ганарысты,

або гісторыя аб тым, як брацік вызваліў сястрычку з ламбарду, закладзеную туды за тры мільёны

Неяк старэйшая сястрычка кінула ля крамы ў калысцы анаго свайго малодшага браціка. Вядома, яго адразу выкралі гангстэры. І запатрабавалі ад бацькоў выкуп у тры мільёны долараў. Бацькі неўцешна рыдалі, але ім нічога не аставалася рабіць, як занесці сястрычку ў ламбард і закласці за тры мільёны долараў. Між тым, брацік за гэты час падрос, адужаў, сам скруціў гангстэраў і здаў іх доблесным польскім паліцыянтам. За гэта яму абвясцілі падзяку і выдалі ўзнагароду, дзякуючы якой брацік вызваліў з ламбарду сваю родную сястрычку.

Хіба ж можна пасля гэтага не любіць свайго браціка яшчэ больш і ўжо ніколі не кідаць яго аднаго ля чужых крамаў!

Дзядзечка Сід

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Сімяон Полацкі

Вяртанне дадому

Якраз тады, калі Самойла быў віленскім студэнтам, пачалася вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй. Вільню захапіла расейскае войска. Царскія стральцы і казакі рабавалі дамы і храмы. Яны здымалі званы, абдзіралі з абразоў каштоўныя аправы, мучылі і забівалі манашак з манахамі. У касцёле святога Міхала захопнікі разбурылі магілу канцлера Льва Сапегі. Заадно спалілі і некалькі праваслаўных цэркваў.

У раскошнай карэце па Вільні ехаў маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч. Дарогу перад ім засцілалі крывава-чырвонай тканінаю. Апрача войска, цара ніхто не сустракаў. Палова віленцаў загінула, астатнія ратавалі жыццё хто як мог.

Трэба было ратавацца і Самойлу. Ён падаўся ў Полацак.

Родны горад сустрэў падарожніка пажарышчамі і падазронымі позіркамі маскоўскіх стральцоў, якія гаспадарылі на вуліцах. Самым надзейным прытулкам для адукаванага чалавека быў у такое ліхалецце манастыр.

Самойла пастрыгся ў манахі і атрымаў новае імя — Сімяон.

Ён пачаў працаваць у той самай школцы, дзе некалі вучыўся. Полацкія хлапчукі любілі манаха Сімяона за цікавыя ўрокі, на якіх ён часта чытаў свае вершы. Вучні з захапленнем ставілі спектаклі ў школьным тэатры, які стварыў іхні настаўнік. П'есы для тэатра таксама пісаў Сімяон.

Неўзабаве ў Полацак прыехаў цар Аляксей Міхайлавіч. Разам са сваімі вучнямі Сімяон выступіў перад ім з чытаннем вершаў.

Тады вучоны палачанін яшчэ не ведаў, што праз колькі гадоў ён пераселіцца ў Маскву і будзе выхоўваць царскіх дзяцей.

(працяг будзе)

Польска-беларуская крыжаванка № 31

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 27: Ціс, стэнд, вуж, жаўранак, бяроза, рабіна, анонс, шафа, тасёмка, ар, Лі. Груша, муж, ар, жаба, вярба, ара, работ, лазіна, нанос, анёл, Элк, СМІ, дуб, явар.

Grupa	▼	Szum	Bunt / Szosa	▼	💾	💾	Zgięcie	💾
Kubrak		Paszcza	▼ ►			💾	▼	💾
►		▼			Anioł	Wiedza		Koza
Pocztowiec ►					▼	▼		▼
►				Niebo	►			
Kasza	Brat		Miód	►			💾	
►				Łyko	►			

Тамара Тарасевіч ў Штатавым цэнтры

James R. Thompson Center — месца прэзентацыі мастацтва Т. Тарасевіч. Штодзень наведвае гэты будынак ад 10 да 20 тысяч людзей.

Мастацкія творы белавежанкі Тамары Тарасевіч выстаўленыя ў траўні ў чыкагскім Штатавым цэнтры імя Джэймса Р. Томпсана ўжо добра вядомыя наведвальнікам таго шматлюднага месца ў Даўнтаўн.

У гэты раз мастачка ў разлеглым атрыюме на першым паверсе будыніны (на здымку) паказала краявіды Белавежы і ваколіц. На думку наведвальнікаў і знаўцаў, супакой, гармонія і краса першабытных краявідаў Белавежскае пушчы даюць ажыўляльны кантраст з драпежнасцю урбанізацыі амерыканскіх метраполій.

Прэзентацыя жывапісу Тамары Тарасевіч планавалася на тыдзень, аднак сустрэла яе настолькі вялікае зацікаўленне, што прадоўжылі яе да канца траўня. У чэрвені выстаўку перанеслі ў бюро губернатара, і застанецца яна там пару месяцаў.

Карціны мастачкі, якая пакінула сваю прафесію медсястры, каб аддаць сябе мастацтву (якім займаецца ўсё жыццё) гасцююць у бюро губернатара ўжо тры гады. Праводзілі там сем вернісажаў яе новых прац у розных стылях — ад рэалістычных, настальгічных пейзажаў, праз стылізаваныя выявы прыроды — роднай белавежскай і новапазнанай амерыканскай, як і універсальнай, народжанай ва ўяўленні мастачкі — да абстрактных карцін, якія перадаюць гледачу рэфлексіі і пачуцці аўтаркі.

Марыя Анто пісала так пра Тамару Тарасевіч у Саюз польскіх мастакоў: „Бачу ў тых карцінах захапляючы каларыстычны талент, сілу, радасць, веру і вялікую адвагу. А адначасова здольнасць ператварыць мастацкімі сродкамі ўласнай паэтыкі, вельмі асабістага бачання свету. Бачу аўтэнтычную творчасць, мастачку, якая, калі возьмецца за цяжкую тэму, нават зацяжкую, стараецца яе адолець. З рашучасцю змагаецца за мастацкі кшталт свайго пейзажа і свае прыроды. І няма ў яе ўцёкаў у лягчэйшую форму, што пры яе размаху і каларыстычнай інтуіцыі было б прасцейшым".

Фрагмент выставы Т. Тарасевіч, ушанаванай нацыянальным сцягам ЗША, сцягам штата Ілінойс і спансараваннем губернатара штата (партрэт).

Пражываючая сёння ў Амерыцы мастачка знайшла ў гэтай краіне вялікае прызнанне — яе працы можна аглядаць не толькі ў Чыкага і ў штаце Ілінойс. Летась вялікім поспехам цешылася яе выстава *Spirit and Freedom of America's Wonderlands* у *Center for Visual and Performing Art* у Мюнстэр у штаце Індыяна. Ад верасня да лістапада, паводле афіцыйных лікаў, наведала яе каля 10 тысяч чалавек.

18 чэрвеня ў *James R. Thompson Center* была адкрыта новая, самая багатая выстава творчасці Тамары Тарасевіч. З Белавежскай галерэі (пераможанай) у Штатавы цэнтр — гэта як скок у космас!

(лук)

Фота Сяргея Тарасевіча

Быў у Гайнаўцы танк

У скверы ў цэнтры Гайнаўкі развальваецца пастамент, на якім калісь стаяў танк. Пра гісторыю гайнаўскага танка расказвае мясцовы мастак Віктар КАБАЦ:

У пачатку сямідзесятых гадоў паявілася хваля спісаных з узбраення танкаў. У Гайнаўку прыехаў танк з Любліна, самастойна ўпоўз на пастамент; пасля з яго выманцiравалі рухавік. Гайнаўка, вядома, радавалася, што атрымала танк. На ягоным ствале былі чатыры крыжыкі, значыць столькі варожых танкаў ён збіў. Пра новую ролю танка завязалася ў Гайнаўцы даволі доўгая дыскусія. Дырэктар Гайнаўскага дрэваапрацовачнага прадпрыемства Аляксей Зін і я былі за тым, каб аставіць яго як гістарычную памятку, супраць прысвячэнню яго на „помнік ахвярам фашызму". У апошнюю вайну

танкі праз Гайнаўку не ехалі, толькі на абмежках Дубін і Навасадаў праехала некалькі танкаў у напрамку Нарвы. Аднак на партыйнай экзекутыве вырашана было прысвяціць танк ахвярам фашызму. Сакратар парткамітэта Людвік Бартосяк сказаў, што танк трэба паставіць у цэнтры горада, каб людзі, якія будуць праязджаць праз Гайнаўку, добра яго бачылі.

Быў яшчэ і рэлігійны аспект, які атрымаўся ў выніку партыйнай дыскусіі: ствол танка не можа быць накіраваны на ўсход, толькі на захад, бо ж у тым напрамку рухаўся гэты танк. І сталася так, што дула танка скіравалі ў бок касцельнай вежы, што некалькісот метраў ад яго. Аднак такі аспект справы быў мала важны ў партыйных меркаваннях.

Калі ўладу ў Гайнаўцы ўзяла „Салідарнасць", Рада горада вырашыла зняць танк, а на яго месца паставіць іншы помнік. Апрацоўку праекта даручылі мне і скульптару, майму вучню, Ярку Пэршку. Узялі мы кусок пластыліну і вымадэліравалі помнік: лацінскі алюміневы крыж вышынёю ў 6,5 метра з сімвалам „V". У мастацкім сэнсе плоскасць прабівае магутную аснову, на якой стаяў танк; аснова мэтанапраўлена разбіта, быццам ад удару мяча. У выніку таго разбуральнага ўдару на канцы ўзняўся крыж, які стаў сімвалам агульнага яднання: і людзей вайны, і людзей міра. Пра гэта сведчыць і дзвюхмоўнае прызначэнне помніка ахвярам вайны, насілля і пакут...

Ад аўтара: Гайнаўскі танк Т-34, калі яго знялі з пастамента, купіў земляроб з Кашалёў Сцяпан Хурса. Пасля некалькіх гадоў памяняў ён уласніка і цяпер стаіць пры шашы Піш — Шчучын на колішняй польска-прускай мяжы.

Міхал Мінцэвіч

Фота аўтара

Фільмавы вечар

На гэты тыдзень прапаную тры навейшыя фільмы.

„Прадказанне" Марка Пэлінгтона, на аснове кніжкі Джона Кэла, паўстала на пачатку 2002 года. Гледачы пераносяцца ў 1967 г. у горад Поінт-Плесэнт, у Заходняй Вірджыніі. 15 снежня, а 17 гадзіне, у час найбольшага руху праваліўся мост. Катастрофа трывала 45 секунд. Загінула 47 асоб, целы якіх знаходзілі часам па некалькіх месяцах. Следства трывала чатыры гады і закончылася высновай, што прычынай катастрофы была стомленасць матэрыялу. Не памаглі нават паказанні сведкаў аб з'яўленні асаблівай істоты — чалавека-начнога матыля, высокай постаці з крыламі і чырвонымі вачыма, падобнымі на пражэктары. Героем фільма з'яўляецца журналіст газеты „Вашынгтон пост" (у ролі Рычард Гір), які стараецца рассакрэціць таямніцу выпадку. Дапамагае яму паліцыянтка (Лаўра Ліней). Следства праходзіць хутка. Паяўляюцца толькі невядомыя пункты, цесна звязаныя з чалавекам-матылём. Фільм спадабаецца аматарам катастрафічнага кіно, поўнага спецыяльных эфектаў, асабліва пад канец, калі правальваецца мост.

„Гэт Картэр" у рэжысуры Стывена Кей гэта прапанова аматарам фільмаўбаевікоў. У галоўнай ролі пабачым Сільвестра Сталоўна (які, нягледзячы на сталы ўзрост, прэзентуецца ў фільмах таксама цудоўна як 10 ці 15 гадоў таму).

У горад вяртаецца славуты спецыяліст па сыскванні даўгоў. Прычынай гэтаму з'яўляецца смерць брата. На пахаванні галоўны герой, Джэк Картэр, даходзіць да вываду, што ягонага брата забілі. Рашае астацца і пакараць вінаватых. Пры нагодзе свайго прыватнага следства адкрывае шэраг афёраў, у якіх замешаны кіраўнікі горада. На экране пабачым Міранду Рычардсан, Майкла Кэйна, Мікі Рурка і Рэйчэл Кук.

А для дзяцей рэкамендую мультфільм „Памажыце! Я — рыбка" — казку, поўную добрых дыялогаў і цікавых спецыяльных эфектаў. Трое дзяцей трапляе ў лабараторыю навукоўца, які намагаецца вырашыць праблему перанаселенасці Зямлі, перамяняючы ўсіх у рыб. Малая Стэла памылкова выпівае эліксір і перамяняецца ў марскую звязду. Сябры рашаюцца памагчы і з гэтага моманту пачынаюцца прыгоды дзяцей. Фільм паказвае, што сяброўства — гэта вялікі скарб, якім трэба даражыць!

Паўліна Шафран

На святым паўвостраве Афон (5)

Ахвяравалі жыццё Богу

Саборная царква Філафейскага манастыра і жыллёвыя будынкі.

Першая дарога, на якую ўвайшлі мы пасля выхаду з Іверскага манастыра, вяла вакол манастырскіх будынкаў. З-пад Іверскай крыніцы выходзілі яшчэ іншыя дарогі. Не ведалі мы куды падацца, паколькі даволі агульна растлумачылі нам дарогу ў Філафейскі манастыр. На гэты раз дапамог грэк, якога спаткалі мы непадалёк скрыжавання. Спачатку перамяшчаліся мы па гравійнай дарозе, якая круцілася каля берага мора і слухалі яго шуму. Захапляцца марской прыродай перашкаджаў туман пылу, што падымаўся з гравійна-пясчанай дарогі і абсыпаў навакольную расліннасць. Калі павярнулі мы на крутую сцяжынку, што падымалася ўверх, пачулі свежы пах прыроды. Далей ішлі ўжо сярод густых дрэў. Захапляліся мы яшчэ зялёнай расліннасцю, што жаўцее ў ліпеньскую засуху.

Выйшаўшы з лесу, убачылі мы старажытны манастыр і людзей ля таксафона. Побач іншых манастыроў таксама стаяць тэлефоны. Раней паломнікі рэдка кантактаваліся з Афона са сваімі блізкімі, а ўсе жыццёвыя нягоды ўскладалі на волю Божую.

У Філафейскім манастыры вельмі сардэчна прыняў нас нямецкі манах, які крыху ведаў рускую мову. Салідна накарміўшы нас, адвёў на начлег у сямімесны пакой. Паколькі мы не паспелі на вячэрнія багаслужэнні і не прыкладаліся да манастырскіх святасцей, рашылі тады астацца ў манастыры два дні. Хаця харчаванне і начлегі на Святой Гары бясплатныя (паломнікі пакідаюць у манастырах толькі грашовыя ахвяраванні), то ў выпадку даўжэйшай за адзін дзень пабыўкі могуць папрасіць паломнікаў дапамагчы ў нейкіх працах. Нас у Філафейскім манастыры папрасілі перабіраць фасолю. Паслушнікі на кухні мусяць моцна напрацавацца, каб накарміць вялікую колькасць паломнікаў, якія пастаянна наведваюць манастыры.

У гэтым грэчаскім манастыры заўважылі нас рускія паслушнікі. Аказалася, што ўжо амаль паўгода Віктар і яго сын Яўген жывуць у Філафейскім манастыры. Раней яны доўга шукалі сабе месца на Афоне. Спачатку па прычыне слабога ведання грэчаскай мовы адпраўлялі іх у Афонскае падвор'е ў Маскве і там раілі пачынаць манаскае жыццё. Аднак, манахі не рашыліся вяртацца ў Маскву і надалей шукалі сабе тут месца. Прынялі іх вельмі сардэчна толькі ў Філафейскім манастыры, дзе побач грэкаў моляцца прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. У Філафейскім манастыры высокі духоўны ўзровень жыцця. Духоўнікам тут з'яўляецца айцец Яфрэм — вучань вядомага на Афоне старца Іосіфа (яго астанкі пакояцца ў Новым Скіце на Афоне), якога жыццё і духоўныя парады апісаны ў кніжках перакладзеных на рускую мову. Айцец Яфрэм зараз пастаянна жыве ў ЗША. Там ён назірае за духоўным жыццём праваслаўных манахаў, вучыць іх правільнаму жыццю (на размовы з афонскімі манахамі прылятае з Амерыкі).

Манахі і паслушнікі многа часу адводзяць малітвам, а асабліва Ісусавай малітве (Госпадзе Ісусе Хрысце памілуй мя), якую паўтараюць безупынна ў час манастырскіх заняткаў і адпачынку. Гавораць малітву ў думках, нават калі слухаюць сваіх суразмоўцаў. Ісусавай малітве навучаў старац Іосіф, а яго пераемцам з'яўляецца айцец Яфрэм. Ісусава малітва садзейнічае хуткаму духоўнаму росту манахаў. Аднак для духоўных поспехаў патрэбны пасты і доўгія малітвы ў царкве. У Філафейскім манастыры манахі самі абмяжоўваюць колькасць харчавання і многа моляцца. Устаюць яны апоўначы і да чацвёртай гадзіны раніцы моляцца ў сваіх келлях. Пазней сыходзяць у царкву на супольныя малітвы, якія канчаюцца ў 7-8 гадзін раніцы. Пасля снедання і кароткіх сяброўскіх размоў манахі ідуць на 1-3 гадзіны адпачынку і затым бяруцца за выкананне манастырскіх заняткаў, увесь час займаючыся Ісусавай малітвай. Тыя, у якіх менш манастырскіх прац, могуць крыху адпачыць перад вячэрнімі багаслужэннямі, якія пачынаюцца ў 5-6 гадзін пасля абеду. Пасля вячэры манахі коратка моляцца ў царкве і разыходзяцца на малітвы па келлях. Пазней на некалькі гадзін ідуць спаць, каб устаць апоўначы на індывідуальныя малітвы. Сваё жыццё афонскія манахі ахвяравалі Богу і таму стараюцца запоўніць яго малітвамі. Толькі частка з тых, якія рашаюцца застацца на Афоне, становяцца манахамі. Іншыя вяртаюцца ў свае краіны з-за хвароб і непрыстасавання да цяжкога манаскага жыцця. Рускія паслушнікі Віктар, Яўген і Аляксандр (астатні з Пецярбурга) хочуць застацца. Усе афонскія манахі прыйшлі моцна папрацаваць на паўвостраве, каб выратаваць свае душы.

У Філафейскім манастыры адчувалася зычлівасць і сяброўскія адносіны да чужаземцаў. Усюды было чыста, а на плошчы каля царквы расла трава, з чым першы раз сустрэліся мы на Афоне. Расла яна дзякуючы працавітасці манахаў, якія палівалі яе. Хаця ў манастыры не было таго бляску, як у іншых адрамантаваных манастырах, царква і манастырскія будынкі былі акуратна памаляванымі. У царкве адчувалася ўтульнасць. Асаблівае ўражанне выклікала ікона Божай Маці „Салодкае цалаванне", якую паводле падання напісаў сам Евангеліст Лука. Гэтая ікона, так як і Іверская, прыплыла пад манастыр па моры. Сярод іншых святасцей можна вылучыць частку нагі свяціцеля Панцялеймана і руку святога Іаана Златавуста, са скурай і ногцямі.

З Філафейскага манастыра пайшлі мы ў Каракалаў манастыр. Яго абарончыя муры збудаваны былі ў XVI, XVIII і XIX стагоддзях і вылучаюцца прыкметамі, характэрнымі для розных эпох. Заснаваны ў XI стагоддзі непадалёк мора манастыр падрыхтаваны быў да абароны ад турэцкіх разбойнікаў. Манахі гэтага манастыра ўспамагалі нацыянальна-вызваленчае змаганне грэкаў супраць туркаў. У другой палове XIX стагоддзя ў манастыр прыбыло многа рускіх манахаў, якія нават хацелі пераняць яго, але гэтага зрабіць ім не ўдалося. Прылажыўшыся да іконы апекуноў манастырскага сабора, апосталаў Пятра і Паўла, адправіліся мы ў далейшую дарогу.

(працяг будзе)

Аляксей Мароз

Абарончыя муры Каракалавага манастыра. Фота Аляксея Мароза

Сеніёры на медаль

Актыўна дзейнічае Клуб сеніёра „Рэха пушчы" ў Гайнаўцы. Існуе ён ад 1974 года. У кожны аўторак пенсіянеры сустракаюцца ў кавярні або ў танцавальнай зале Гайнаўскага дома культуры. Тут амаль штомесячна ладзяць спатканні і танцавальныя вечарыны.

Клуб „Рэха пушчы" супрацоўнічае з сеніёрамі з Бельска-Падляшскага і Нараўкі. Ладзяць супольныя культурна-асветныя або забаўляльныя мерапрыемствы, краязнаўчыя экскурсіі і пілігрымкі ў паломніцкія цэнтры нашай краіны. Наладжваецца дружба. У пенсійным узросце мае гэта асаблівае значэнне, паколькі прадухіляе сумнае адзіноцтва.

Незабыўная вечарына сеніёраў адбылася пры музыцы 25 чэрвеня г.г. у ГДК. Старэйшыя людзі — ажно 110 чалавек з вышэйзгаданых мясцовасцей — шэсць гадзін гулялі пры г.зв. жывой музыцы. У перапынках паміж танцамі спявалі польскія, беларускія і ўкраінскія песні. Увесь час панавала прыемная, сардэчная атмасфера. Тут сеніёры ўмеюць культурна сябе паводзіць. А сеніёркі — як і дагэтуль бывала — нястомныя танцоркі. Так бы мовіць, яны і да танца і яшчэ да ружанца. А дзень быў асаблівы. Шматлікія асобы былі зранку на царкоўным фэсце ў Крыначцы.

Клуб „Рэха пушчы" налічвае за 60 членаў. Старшынствуе — Мікалай Шадуя. Дапамагаюць яму Лідзія Паўліч і Марыя Дунда. Гэта яны супольна наладжвалі паездкі-экскурсіі ў Старую Белавежу, Мельнік над Бугам, над Семяноўскае вадасховішча ды ў Грабарку.

Сёлета яны таксама запланавалі паломніцтва на Спаса ў Грабарку.

Янка Целушэцкі

Ліст у рэдакцыю

Пра Лучыну і агратурызм

Вельмі шаноўныя ніватворцы!

Перадаю сваё шчырае прывітанне і заадно глыбокую ўдзячнасць за дасыланыя раней тыднёвікі. Сярод публікацый знаходзіў шмат цікавага для сябе, сваіх родных і знаёмых. Захоўваю падшыўку. Адразу, прыгадваючы артыкул пра Лучынавы мясціны („Ніва" № 50 ад 16.12.2001 г.), дзе была цікавая фатаграфія паэта (на ганку зялёнай сядзібы сярод радні), хачу ці не ўдакладніць назву рэчкі, якая чамусьці ў газеце названая несапраўдным імем. Гэта, аднак, Жацераўка, калі я ў публікацыі ўсё зразумеў правільна. Праз гэтую рачулку я пераязджаю на ровары, едучы штодзень на свой хутар гасцінцам Стоўбцы — Нясвіж праз Новы Свержань (дарэчы, дарога Сыракомлі). Люба-дорага ўбачыць з шашы яе ўлонне, за паўкіламетра як яна ўпадае ў Нёман. Тут, на высокім месцачковым надрэччы (амаль цэнтр Новага Свержаня) стаяць праз вуліцу касцёл і царква, ніжэй, пры самай дарозе — камяніца колішняга млына, добра захаваная, з чырвонай цэглы, сёння, на жаль, цалкам пустая. Не так даўно я зрабіў здымак Жацераўкі з адзіным намерам — пры першай нагодзе перадаць яго Вам.

Другая мая ўвага датычыць публікацый на тэму агратурызму і наогул грамадскіх ініцыятыў на аднаўленне бацькоўскіх куткоў, будынкаў старых сядзіб, на зберажэнне прыроды і народнай культуры. Мне гэта блізка, дый проста захапляе такі досвед, энтузіязм людзей, якія вяртаюцца на сваю Бацькаўшчыну. Для Беларусі гэта актуальна, аднак пра агратурызм гаворкі пакуль няма, асабістых праектаў падобнага кшталту — адзінкі. Ёсць сэнс падумаць пра гэта разам, можа, наладзіць які семінар, правесці Дзень агратурызму ў Стаўбцоўскім або Нясвіжскім раёнах з удзелам „Нівы" і мясцовых улад, якія, як мне падаецца, праявілі б вялікую цікавасць.

Валеры Дранчук, рэдактар
і выдавец газеты „Белавежская пушча"

Эвакуіравалася на караблі

Сям'я Мюлераў да прыезду аўтаркі ўспамінаў. Справа: гаспадыня, гаспадар з адным сынам, дачка, нянька з другім сынам.

Нарадзілася я ў 1924 годзе. Тады яшчэ бульбу ў загоны садзілі ключкаю, а абгортвалі матыкаю. Пазней сталі садзіць пад плуг, толькі не было прыладаў, каб абгортваць. Мой бацька сам сошку зрабіў з сашніком і адкладнямі, то амаль цэлая вёска пазычала яе ад яго, а ён за гэта не браў ніякай платы.

Школа была чатырохкласная, але трэба было ў яе хадзіць сем гадоў, бо як не пойдзеш, то зараз бацьку забяруць у гміну дровы рэзаць. Я хадзіла адзін год у першы клас і па два ў другі, трэці і чацвёрты. Нават выдатнікі за сем гадоў толькі чатыры класы маглі скончыць. Я вучылася добра і настаўнік гаварыў майму бацьку, каб прадаў карову, а мяне ў Беразова ў школу паслаў; у Ласінцы таксама была сямікласная школа.

У нашай вёсцы адзін меў радыёпрыёмнік з навушнікамі і ў нядзелю па радыё пачулі, што ўспыхнула вайна. А ў панядзелак ужо немцы ў вёсцы былі і тое радыё забралі.

Калі прыйшлі саветы, дык я паціху пайшла ў Гайнаўку і ў школу запісалася. А як вярнулася, то бацька мне вялікую авантуру зрабіў, бо ж трэба грошай і на кнігі, і на кватэру.

Жыла я на кватэры ў цёткі, па Ліповай вуліцы, кватараваліся ў яе яшчэ дзяўчаты і хлопцы. Кватараваўся ў яе таксама рускі з Растова-на-Доне, казак з жонкаю і дачкою. Быў ён загадчыкам *Заготзерна*, а яго жонка была там рахункаводам. Згаварылася я з ёю, што таксама стану на працу ў іх фірме; удзень мела я працаваць, а вечарамі вучыцца ў дзесяцігодцы.

Калі мае сяброўкі і сябры паехалі да бацькоў на канікулы, цётка на іхняе месца закватаравала траіх лейтэнантаў: рускага, башкіра і ўкраінца. У панядзелак я мела стаць першы дзень на працу...

Лейтэнанты паехалі на фронт, але адзін праз нейкі час вярнуўся. Завезлі іх трыццаць тысяч і як немцы далі, то мо толькі сотня асталася. Немцы б'юць, а ім — *нельзя*! Падаўся ён у пушчу, ратавацца ад вайны.

Цётка спакавала мяне і адправіла дадому. Па шашы страляюць, а я бягом цераз палі бягу.

У цёткі жыў пасля Валодзька, цывільны чалавек; яго жонка з Шастакова была. Ён яе адправіў дадому, а сам у партызаны падаўся. Аднойчы, пад вечар, прыйшоў ён да нас, каб пераначаваць яго. Раніцай, чуць свет, немцы да нас едуць, а ён у клуні. Абшукалі, але яму ўдалося ў жыта ўцячы. Тады немцы цётку забралі, бо нейкая баба яе ўдала, завезлі ў Белавежу і павесілі.

Немцы адразу сястру забралі на прымусовыя работы ў Бранева і па сённяшні дзень яна за тое не атрымала ні граша, бо ні дакументаў, ні сведкаў няма. Разам з ёю працавалі француз і паляк з Цеханава — вазьмі і знайдзі іх!

Неўзабаве, вясною 1942 года, і мяне забралі. Бацькі мусілі завезці мяне фурманкаю ў Бельск, там загрузілі нас у таварны поезд, замкнулі дзверы і павезлі. Поезд спыняўся ў Граеве, і ў Простках мы праз акенца пабачылі, што там цукроўня ёсць.

Завезлі нас у Кёнігсберг і толькі там адчынілі дзверы. Рана загналі ў арбайтсамт; аказалася там крыху дзяўчат з Гайнаўкі, Курашава, Сакоў, Горнага. Пасадзілі ў калідоры і па прозвішчы выклікалі. Выклікалі і мяне і пытаюць, ці я ўмею панямецку. Я крыху ўмела, бо пры саветах у школе жыд Шляйфер вучыў. А мы, заміж вучыцца, дражнілі яго: *ich Schleifer, du Schleifer* і г.д. Ну, але як конь ці авечка называецца, то я ведала.

Мела я з сабою чамаданчык, які тата з дыкты зрабіў. Гаспадар, які мяне забраў, называўся Мюлер, узяў ад мяне той чамаданчык і мы пайшлі. Нешта мне паказвае, а я не ведаю, у чым справа. Купіў ён мне слоўнік, чамаданчык пакінуў на нейкай фабрыцы і кудысь ідзем. Зайшлі, кажуць мне распранацца. Бачу — сталоўка, гаспадар заказаў абед. Афіцыянтка прынесла талерку плыткую і глыбокую, лыжку, лыжачку, відэлец, нож. А я дзівуюся, што гэта такое; у нас жа пры Пілсудскім адно лыжка дзеравяная і міска чэрапяная былі. І дзівуюся таму абеду, бо сястра пісала, што ёй нават малака нельга было напіцца. Я глядзела, што гаспадар робіць, то і я тое рабіла.

З'елі той абед і ідзем праз Кёнігсберг. Зноў кудысь заходзім, зноў столікі, зноў сядаем. Прыйшла афіцыянтка, гаспадар заказаў збожжавую каву і салодкае пячэнне на крыштальнай талерачцы, лыжачкі. Я чакаю — як ён есць, так і я. Ён штось тлумачыў, паказваў мне і я здагадалася, што ў пяць гадзін будзе поезд. І так ад дзевятай гадзіны мы хадзілі, а ён цэлы час мой чамаданчык насіў.

Зайшлі мы кудысь, там акенца ў сцяне і чарга. Ён білеты ў кіно купіў, паглядзелі фільм, выйшлі. Павечарэла і падаліся мы на вакзал. Селі ў поезд, у першы клас. „Што за халера!", думаю. Ён паказаў мне, што дванаццаць мінут будзем ехаць з Галоўнага вакзала. Заехалі на станцыю Вігбальд, злезлі з поезда і неўзабаве зайшлі на месца, бо блізка было. Ён пазваніў і выйшла гаспадыня, пытае:

— Якой нацыі?

— Польская.

— Ці ўмее па-нямецку?

— Не.

— *Oh, Gott*!

Было ў іх трое дзяцей: чатырохгадовыя хлопцы-блізнюкі і крыху за іх старэйшая дзяўчынка. Мяне палажылі спаць у дзіцячым пакоі.

(*працяг будзе*)

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Як дайшло да бежанства

1 жніўня спаўняецца 88 гадоў, як пачалася вайна, у якой многія з нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў прымалі ўдзел. Многія з іх палажылі свае галовы на палях баёў, мільёны іх уцякалі ад вайны ў бежанства і былі сведкамі многіх гістарычных падзей.

Канфлікт у пачатку XX стагоддзя паміж чатырма дзяржавамі: Германіяй і Аўстра-Венгрыяй — з аднаго боку, ды Францыяй і Расіяй — з другога нарастаў. Неўзабаве зручная прычына для вайны знайшлася: 28 чэрвеня 1914 г. у Сараеве выстраламі з рэвальвера член сербскай арганізацыі „Маладая Боснія" Гаўрыла Прынцып забіў наследніка аўстрыйскага прастола Франца Фердынанда і яго жонку Сафію. Аўстрыя паставіла сербскаму ўраду востры ультыматум: Сербія павінна ліквідаваць антыаўстрыйскія арганізацыі, увольніць са сваёй арміі ўсіх афіцэраў указаных Аўстрыяй, асудзіць усіх пагранічнікаў прапусціўшых забойцу, прапусціць у Сербію прадстаўнікоў аўстрыйскага камандавання для расследавання забойства. Сербскі прэм'ер звярнуўся за парадай у Пецярбург. Яму параілі прыняць зневажальныя патрабаванні. На ўстаноўлены тэрмін Сербія прыняла ультыматум, але Аўстрыі была патрэбна зачэпка для вайны. Яна адкінула згоду Сербіі і 28 ліпеня 1914 г. аб'явіла ёй вайну. У Расіі адбыліся дэманстрацыі супраць напасці на Сербію і была аб'яўлена частковая мабілізацыя. У суботу 1 жніўня 1914 г. у 7 гадзін вечара нямецкі пасол у Пецярбургу Фрыдрых Пурталес уручыў расійскаму міністру Сяргею Сазонаву ноту аб аб'яўленні Расіі вайны, быццам у „абарону Аўстра-Венгрыі", хаця Расія ў стане вайны з Аўстрыяй не была. Толькі ў 18 гадзін 6 жніўня Аўстра-Венгрыя аб'явіла вайну Расіі. Паступова ў вайну былі ўцягнуты 38 дзяржаў.

Немцы хутка павялі наступленне на заходнім фронце і падышлі амаль пад Парыж, каб выэлімінаваць з вайны Францыю, а затым абярнуцца ўсімі сіламі супраць Расіі. Бачачы гэта, рускае камандаванне без добрай падгатоўкі павяло наступленне на Усходнюю Прусію. Немцы змушаны былі частку сіл перакінуць з заходняга фронту на абарону Усходняй Прусіі. Руская II армія генерала Самсонава пацярпела ў Прусіі паражэнне, а ён сам застрэліўся. У барацьбе германцаў са славянскай Расіяй значная частка польскага насельніцтва Кангрэсуўкі была на баку Расіі.

Вясною 1915 г. немцы свой пункт цяжару перанеслі на ўсходні фронт. На пасяджэнні 5 ліпеня 1915 г. у Седльцах рускае камандаванне рашыла адступіць, каб не даць немцам і аўстрыйцам ударамі з Усходняй Прусіі і з Любліншчыны ўзяць рускія арміі ў вялікі кацёл. Адступленне было праведзена планамерна, часта нават з музыкай. Канчаткова фронт стабілізаваўся на лініі Рыга — Дзвінск — Баранавічы — Пінск — Луцк — Станіславаў. Далей немцаў не пусцілі і фронт стаяў на гэтай лініі аж да канца 1917 г., калі руская армія была разложана рэвалюцыяй, якую падтрымлівала Германія і яе агенты.

Адступленне рускіх войск у 1915 г. выклікала масавае бежанства праваслаўнага насельніцтва. Абавязак эвакуіраваць мелі толькі чыноўнікі. Адны, больш граматныя, уцякалі з патрыятычных меркаванняў, бо Расія, пасля адмены паншчыны ў 1861 г., пасля парцэляцыі і распродажы маёнткаў польскіх феадалаў, бяспечнага існавання Праваслаўнай царквы, мела многа стаpоннікаў: другія баяліся здзекаў акупанта, трэція, найменш адукаваныя, глядзелі што рабілі першыя і другія, і таксама кінуліся ў бежанства. Дапамога ўлад бежанцам была досыць добрая: на вузлавых станцыях былі бясплатныя „питательные пункты", рускія вайскоўцы добра плацілі за прадаваную ім жывёлу. Але медыцына была тады яшчэ слабой, таму пры рухах мільёнаў людзей тыф і халера касілі свае ахвяры. Тацянінскі камітэт дапамогі бежанцам зарэгістраваў 3 306 051 бежанца (а іх было значна больш) з Віленскай, Гродзенскай, Холмскай і Валынскай губерняў. Былі ім арганізаваны розныя курсы, адукаваныя атрымалі працу, а рускі народ вельмі сардэчна прымаў уцекачоў і памагаў ім, што ўсе бежанцы пасля згодна пацвярджалі.

Цяжка стала бежанцам толькі пасля рэвалюцыі, а асабліва калі пачалася грамадзянская вайна. Звычайна, ні „чырвоныя", ні „белыя" бежанцаў не чапалі як „пацярпеўшых ад вайны". Некаторыя бежанцы прымалі ўдзел у грамадзянскай вайне: адны на баку „чырвоных", другія, больш адукаваныя, меўшыя чыны афіцэраў — на баку „белых" і гэтыя ў большасці загінулі. Бежанец з вёскі Козлікі, што каля Заблудава, Васіль Сакалоўскі ваяваў на баку „чырвоных", астаўся ў СССР і даслужыўся звання маршала; другі бежанец з Белавежы, Аляксандр Вашкевіч, таксама ваяваў на баку „чырвоных", астаўся ў СССР і даслужыўся чына генерала. Мой дзядзька Дзмітрый Капчук, праўда, па маладосці, у грамадзянскай вайне не ўдзельнічаў, але астаўся ў Маскве, даслужыўся звання маёра і ў 1945 г. з войскам маршала І. Конева вызваляў Кракаў. Другі мой дзядзька, ваенны фельчар, фельдфебель Антон Капчук загінуў у 1917 г. на фронце ў раёне Маладзечна.

Вяртанне бежанцаў пачалося ў 1919 г. і працягвалася да 1922 года ўключна. Трэба тут сказаць, што адступаючыя ў 1915 г. рускія войскі ўчынілі толькі мінімум разбурэнняў і ацалілі нават важныя ў час вайны прыгожыя вакзалы ў Седльцах, Чаромсе, Гайнаўцы, Бельску, Граеве і Беластоку. Але сельскія гаспадаркі зараслі бур'яном. Больш адукаваныя і таленавітыя бежанцы, пабачыўшы многа гістарычных падзей, пераездзіўшы многа губерняў Расіі, спатыкаліся з рознымі людзьмі і таму накапілі вялікі жыццёвы вопыт, народную мудрасць. Сітуацыя была цяжкая, але дзякуючы працавітасці, нядаўнія бежанцы пачалі ставаць на ногі. У адроджанай Польшчы свае палажэнне амаль усе праваслаўныя лічылі вельмі кепскім. Польская адміністрацыя пастаянна прыдзіралася да Праваслаўнай царквы, на працу ў дзяржаўных установах (за малымі выключэннямі) прываслаўных і яўрэяў не дапускала, а сыны нядаўніх бежанцаў у Польскім Войску маглі даслужыцца ў найлепшым выпадку да чына капрала (дзве нашыўкі). Што тычыцца тых, якія ў бежанства не паехалі, то лёс іх таксама не быў ружовым. У тадышняй Германіі, акружанай франтамі і марской блакадай, панаваў голад і нават тылавыя нямецкія салдаты галадалі. Таму астаўшымся на месцы нашым сялянам пакідалі на гаспадарку толькі аднаго каня і адну карову.

Мікалай Капчук

Гарачы час

Жніво сёлета пачалося раней чым у мінулым годзе. У Кузаве, напрыклад, некаторыя гаспадары выйшлі касіць перад Пятром і Паўлам, а на Рызы, 15 ліпеня (прысвятак у вёсцы, калі выходзілі зажынаць жыта), стаяла ўжо на полі перапеліца, знак заканчэння жніва.

Паехаў я ў панядзелак 22 ліпеня на кляшчэлеўскі кірмаш. Нямнога было людзей.

— Жніва, гарачы час, — гаварыў знаёмы селянін з Залешанаў.

Для земляроба няма адпачынку ад вясны да восені. Сяўба, касьба, жніво і капанне бульбы, гэта цяжкая праца. У зімовую сцюжу можна прысесці. А карысць якая? Збожжам ніхто не цікавіцца. Парасятка па 180-200 зл. цэняць, але пакупнікоў няма. Гародніна сёлета абрадзіла. Агуркі прадаюцца па 0,50-1 зл., памідоры ад 80 гр. да 2 зл. Самыя адборныя.

Швагер з Падбелля рэкамендуе:

— Бяры, Валодзька, маліноўкі, такіх яшчэ не прабаваў. Дачка за фермера ў Амерыку замуж выйшла. Насенне прыслала. Жонцы завязеш...

Не пакарыстаўся я навінкай.

— У суботу на рынаку тры кілаграмы купіў, — адказваю сваяку. — Залежваюцца. Агурочкі ў сваім агародчыку растуць, як на дражджах. Без хімічных угнаенняў. Экалагічныя...

Няўдачлівы кірмаш для гандароў і агароднікаў. Многія з таварам вяртаюцца назад з думкай, што мо ў наступны панядзелак іхні дзень будзе. Але нічога не парадзіш. Такая ўжо сялянская доля.

Уладзімір Сідарук

Неабходная мадэрнізацыя

У Прадпрыемстве водаправодаў і каналізацыі ў Гайнаўцы вядуцца мадэрнізацыйныя працы па паляпшэнні якаснасці вады, якая пастаўляецца жыхарам горада. Водаправоды ў Гайнаўцы пракладаліся ў пасляваенны перыяд і патрабуюць мадэрнізацыі. Зараз 80-кіламетровай водаправоднай сеткай дасылаецца каля 98% вады на патрэбы індывідуальных карыстальнікаў і прадпрыемстваў. У вадзе ўтрымліваецца большая чым прадбачваюць польскія нормы колькасць жалеза, марганцу і аміяку, таму ў Станцыі паляпшання якаснасці вады састаў вады даводзіцца да нормы. Аднак і Станцыі неабходная мадэрнізацыя. Зараз штомесяц паласкаецца ўся водаправодная сетка і фільтры. На працягу бліжэйшых чатырох гадоў прадбачваецца мяняць знішчаныя трубы.

У мінулыя гады Прадпрыемства водаправодаў і каналізацыі разбудоўвала гарадскую каналізацыйную сетку, што далучана да новай ачышчальні сцёкаў.

— Ачышчальня сцёкаў ахоўвае раку Лясную і Белавежскую пушчу. Узнікла ў нас праблема выкарыстання цвёрдых асадкаў. Можна прымяняць іх як угнаенне, але нашы гаспадары яшчэ не пераканаліся ў гэтым і таму разважаем ці не давозіць нам асадкаў на сялянскія палі, — кажа старшыня прадпрыемства Юрый Алексяюк.

Ачышчальня сцёкаў у Гайнаўцы выкарыстоўвае толькі каля 50% сваіх тэхналагічных магчымасцей і кіраўніцтва прадпрыемства намагаецца разбудаваць каналізацыйную сетку і пабольшыць колькасць яе карыстальнікаў. Управа прадпрыемства намагаецца пачаць інвестыцыю, якая дазволіла б поўнасцю адводзіць дажджавую ваду па-за каналізацыйнай сеткай. Зараз пасля зліўных дажджоў вада ўліваецца ў каналізацыйныя трубы і пабольшвае колькасць сцёкаў, якія трэба ачышчаць. Рамонту патрабуе каналізацыйная сетка, знішчаная каранямі дрэў.

Кіраўніцтва прадпрыемства плануе на працягу 2-3 гадоў пабудаваць каля 17 кіламетраў каналізацыйнай сеткі (з 1998 года пабудавалі каля 40 км каналізацыі і 3 км водаправодаў). На працягу бліжэйшых чатырох гадоў прадбачваецца ўкараніць новыя утылізацыйныя тэхналогіі. Зараз ідзе будова магазіна санітарна-тэхнічнага абсталявання. Нядаўна Прадпрыемства водаправодаў і каналізацыі пераняло адміністраванне водаправоднымі сеткамі і артэзіянскімі калодзежамі ў суседніх гмінах. Апошнім часам будавалі каналізацыю ў Новым Беразове і падключылі яе да ачышчальні сцёкаў у Махнатым.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Гарадская ачышчальня сцёкаў выкарыстоўвае толькі палову сваёй магутнасці.

Больш культуры

Насупраць чыгуначнай станцыі ў Чаромсе працуюць дзве прадуктовыя крамы і „Cafe-Bar" з півам. Гандлёвыя пункты знаходзяцца пры вуліцы. Непадалёк стаянка для аўтафураў, дзе праводзіцца мытны кантроль. Амаль штодзень праязджаю побач крамаў і бачу, як сябе паводзяць аматары піва. Праўда, абыходзіцца пакуль што без скандалу, але від ап'янелых падросткаў і лексіка, якой карыстаюцца выклікае ў прахожых агіду. Прытым трэба дадаць, што выпівохі афармляюць свае фізіялагічныя патрэбы за... вуглом кладоўкі. Такое можна прыкмеціць побач крамы „Плюс". Прадпрымальнік задбаў пра месцы сядзець кліентам пад парасонам, але забыў паставіць... нужнік. Разумею, што абсурдам было б будаваць туалеты для кліентаў побач кожнай крамы, але, калі ўжо такі дабрадзейны пан дбае пра культуру, дык мог бы і такое зрабіць.

Закон забараняе спажываць піва ў краме і побач яе. Чаму ж тады адказныя ўстановы прыплюшчваюць на гэта вока? А мо паступаюць паводле гаворкі: „Нічога не знаю, бо мая хата з краю". (ус)

Закалот вакол выбару дырэктара

У час апошняй сесіі Рады Гайнаўскага павета разглядалася справа конкурсу на дырэктара Комплексу прафесійных школ. Управа Гайнаўскага павета адкінула рашэнне конкурснай камісіі, якая на дырэктара Комплексу школ вылучыла цяперашняга дырэктара Міхала Садоўскага. Прычына — конкурс праведзены быў няправільна, бо ўдзельнічалі ў ім асобы, якія не мелі адпаведнай адукацыі. Да змагання за пасаду дырэктара прыступілі тры кандыдаты: Міхал Садоўскі, яго намеснік Ян Кавэцкі і Казімеж Пулторак. З іх толькі Ян Кавэцкі закончыў Паслядыпломную школу ўпраўлення асветай, якая неабходная, каб прыступіць да конкурсу на пасаду дырэктара. Міхал Садоўскі акурат канчаў гэтую школу і не меў яшчэ пасведчання аб яе заканчэнні. Згаданай школы не закончыў трэці кандыдат. Камісія хацела дапусціць да конкурсу толькі аднаго кандыдата, але Кураторыя асветы настойвала, што правільным будзе дапусціць да конкурсу Міхала Садоўскага паколькі канчаў ён школу ўпраўлення. Выйграў конкурс Міхал Садоўскі, які атрымаў 8 галасоў. На Яна Кавэцкага гласавалі 3 асобы, а на Казімежа Пулторака — адна. Дырэктара мае назначыць Управа Гайнаўскага павета. Радныя прасілі пакінуць на пасадзе цяперашняга дырэктара Міхала Садоўскага, паколькі давёз ён патрэбнае пасведчанне. Зараз удзел у конкурсах на пасады дырэктараў школ моцна абмежаваны, паколькі ў школах кіравання асветай найчасцей вучыліся толькі сённяшнія дырэктары.

На пасяджэнні радныя прынялі пастанову аб падзеле Гайнаўскага павета на 4 выбарчыя акругі для самаўрадавых выбараў. Жыхары горада Гайнаўкі выбяруць 8 радных. Па 3 радных будуць выбірацца ў трох іншых акругах: I — Чаромха, Кляшчэлі і Дубічы-Царкоўныя; II — Нарва і Нараўка; III — Белавежа, гміна Гайнаўка і Чыжы. (ам-з)

Гасціна для цёткі з Амерыкі

Ігнат падаўся у горад у той час, калі панавала паўсюдная міграцыя вясковай моладзі ў горад. Закончыў тут курсы шафёраў і пачаў працаваць вадзіцелем у транспартным прадпрыемстве. Зарабляў добра. Купіў у Беластоку ўчастак і з дапамогай бацькоў пабудаваў прыгожую драўляную хату.

Цяпер Ігнат пенсіянер. Нядаўна я сустрэўся з ім. Успомнілі мы мінулыя гады, а паколькі былі добрымі сябрамі, дык і чарачку зрабілі. Пагутарылі аб нашым жыцці-быцці, а Ігнат прыгадаў даўніх сяброў, між іншым, знаёмага шафёра Уладзіслава М. Расказаў як калісьці, быўшы яшчэ кавалерам, пабываў у гасцях у Уладка.

Было гэта летам, — пачаў свой расказ Ігнат. — Падыйшоў да мяне Уладак і кажа:

— Ігнась, ты жывеш адзінока, пераважна на сухім харчаванні, прыйдзі ў суботу да мяне ў госці, паясі смачна, а то на сухім змарнуеш страўнік. — Прыехала да нас жончына цётка з Амерыкі, неўзабаве збіраецца ад'язджаць і мы з жонкай пастанавілі выправіць ёй гасціну, можа будзе больш долараў прысылаць, — сказаў Уладак.

Пакарыстаўся я запрашэннем сябра. Калі зайшоў туды, госці ўжо збіраліся. Пасля паселі за сталы і мне давялося сядзець недалёка амерыканкі. На сталах не было звычайнай каўбасы, закуска самая лепшая, дарагая. Гарэлка жытняя з Пэвэксу ды гатунковыя каляровыя рознага смаку. Пачалі выпіваць, а тая амерыканка ўмочыць у кілішак свае намаляваныя вусны і адстаўляе чарку. Узносілі госці тосты — за здароўе цёткі-амерыканкі, за сто гадоў жыцця, каб хутчэй ізноў прыехала ў Польшчу і г.д. Паплылі застольныя спевы, прыйшоў гарманіст, п'яныя госці сталі танцаваць, а тым часам цётка сядзела за адной нявыпітай чарачкай. Потым устала і выкрыкнула:

— Вы лінагузы, п'яніцы, навошта я вам долары прысылала! Каб так у нас пілі, як вы цяпер, дык я ўжо даўно пайшла б жабраваць. — Сказаўшы гэта пайшла ў свой пакой. Ад'ехаўшы ў Амерыку не прыслала ні аднаго долара.

Вось, якую гасціну выправіў Уладак для цёткі з Амерыкі.

Мікалай Лук'янюк

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2002 r. upływa 5 września 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2002 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота Рамана ВАСІЛЮКА

— Я сёння рана глядзеў перадачу на трэцім тэлеканале. Дзікія скокі памаляваных усяляк у Гарадку... Хто такую праграму выдумаў!? Гэта прыніжанне нашай нацыі. Мы з жонкай любім гэту мову, але не магу ўжо гэтага вытрываць! Ці вы нешта зробіце, каб такога не было? (з тэлефона ў рэдакцыю)

(ав)

Жахі на даху

Лета такое гарачае. Хто жывы, сунецца ў цянёк. Але ёсць і такія, што любяць пячыся на сонейку, не палохаюцца ніякім шкодным праменнем, плямамі на Сонцы і на ўласнай скуры. І чым бліжэй таго сонца прупца. Ці ж не бліжэй яго ёсць дах у блёку? Ляжыш як на патэльні, смажышся, адно варочайся як той наліснік на два свае бакі. Некаторыя, замест паехаць на возера ці хоць якую сажалку, бяруць дый паліваюцца на той патэльні вадой. А каб сонца яшчэ больш узяло, шмаруюцца хто чым можа. Агаціна сяброўка Клава дык нават маслам націрала сваё булкападобнае цела; ад яго харошы залацісты загар. Дык сёння Клава як добра спечаная булачка, але і з прыгаркай. У бальніцы сёння Клава, не на надблокавай патэльні. Ды іншыя, нават і мая Агата, часта там сабе адлежваюцца.

Аднойчы ў нашу хату ўляцела Агата, уся чырвоная ды бліскуча-ліпучая ад крэму, з валасамі дубам. У купальніку бегла, плед і ручнік не забрала, а што казаць пра сукенку.

— Ты што, чорта ўбачыла? Сама, пэўна, напалохала не аднаго, бы з патэльні злезшы...

— Чорт, чорт, не тут гаворачы! Д'ябал кастрабаты! Як я цябе жывым бачу, Вандал, так выглядаў ён! А ёйкі-ёйкі!

— Ну ж, я, здаецца, чорту не раўня, як ні старайся! — ці не абразіцца мне на сваю кабету? — Можа, бегчы па ксяндза, каб экзарцызмы адправіў, чорта выгнаў з нашага даху?

— Ты не жартуй! Сапраўдны чорт! Думалі спачатку, што камінар, а ён сапраўдны — з капытам! І з рожкамі!

— А што з хвастом?

— І з хвастом!

— Мабыць, як у „Пані Твардоўскай", апрануты па нямецкай модзе? Пераапрануўся хтосьці, баб'ё напалохаць.

— Акурат па модзе! Без штаноў! Калматы ўсенькі... Толькі не ідзі туды, Вандал, яшчэ табе ён што зробіць!

Кульнула Агата кілішак валяр'янкі, ускочыла пад халодны душ. А я палез па лесвічцы на апошнім паверсе, на чорта падзівіцца.

А на даху чорта няма, і нікога іншага. І пледаў, і ручнікоў, і сукенак. Быццам нікога тут раней не было. Не, толькі паперы ад бутэрбродаў ганяе вялы ветрык, ужо мацнеючы. Збіраецца на перамену надвор'я... Ці не ад празмернага загарання прывідны той чарціска паказаўся кабеткам?

Вандал Арлянскі

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Пан доктар, не ведаю, што са мною дзеецца! Не адчуваю шчасця. Маю ўсё: многа грошай, прыгожую жонку, дзве вілы, яхту, лімузін, я малады, усё мне ўдаецца. На жаль, я нешчаслівы, бо сумняваюся ў сваёй інтэлігенцыі...

Псіхіятр сумна паківаў галавою:

— Вы хіба маеце рацыю.

* * *

Амерыканскі турыст наведаў касцёл у Іспаніі і пабачыў там вісячую перад алтаром сярэбраную мышку. Пацікавіўся ў экскурсавода, што гэта абазначае.

— Даўным-даўно на наш горад нахлынулі мышы. Гараджане не мелі ўжо чым труціць грызуноў і вырашылі зрабіць імшальную ахвяру і павесіць яе ў храме. Калі гэта зрабілі, усе мышы прапалі.

— І вы верыце, што так было?

— Дзе там! Калі б верылі, то даўно ўжо вісеў бы тут сярэбраны амерыканец.

* * *

У музеі:

— Гэтая мумія вельмі старая? — цікавіцца турыстка ў гіда.

— Яшчэ як! — адказвае праваднік. — Шаноўная пані побач яе выглядае як дзіця.

* * *

У Белавежы сустракаюцца два турысты:

— Прыехаў сюды, каб насалоджвацца прыродай, пашыраць кругагляды, заглянуць у вечнасць.

— А я прыехаў з Варшавы, бо мая дачка пачала браць урокі ігры на фартэпіяна.

* * *

Два вандроўцы сядзяць у горнай турбазе і глядзяць за акно; пабачылі праходзячы статак бараноў. Адзін вандроўнік кажа:

— Вось перад намі праходзіць статак астрыжаных бараноў.

— Сапраўды астрыжаныя, — адказвае другі. — Прынамсі з гэтага боку.

* * *

Сустракаюцца два турысты:

— Чуў я, што ты ажаніўся...

— Так! — з захапленнем адказвае другі. — І цяпер яна стала мне цэлым светам.

— Спачуваю табе, бо ведаю, колькі каштуюць падарожжы вакол свету.

* * *

Малы Вова вяртаецца са школы дадому, кідае сумку і заяўляе бацькам:

— Сядзіце дома і пра нішто не ведаеце! Сюсік называецца зусім інакш!

* * *

— Чаму ў разгар буры выходзіш на паляванне? — пытае жонка мужа.

— Мо пашчаслівіцца і гром заб'е мне нейкага зайчыка.

* * *

— Мама, я не хачу выходзіць за Андрэя! Ён цэлы час жмурыць вочы...

— Не бойся, пасля шлюбу яны яму раскрыюцца.

Крыжаванка



Гарызантальна: 4. алфавіт, 7. паўднёвае фруктовае дрэва з жоўта-чырвонымі салодкімі пладамі, 8. колькасць пражытых гадоў, 9. абкрутка, напр. ізаляцыйная, 10. месца зімовых алімпійскіх гульняў у 1998 годзе, 14. прырода, 18. цэнтр медзяной металургіі ў Польшчы, раней там — вялікі савецкі гарнізон, 19. тоўстая аглобля для парнай запрэжкі, 20. вёска Алеся Барскага, 21. індуісцкі храм.

Вертыкальна: 1. буйны дзённы матылёк з жоўтымі крыламі ў чорныя крапікі, 2. перавага, першаснасць, 3. аднамесная спартыўная лодка з падвесным маторам, 4. егіпецкі горад з пляцінай на Ніле, 5. край зямлі каля вадаёма, 6. воданепранікальная камера для падводных будаўнічых работ, 11. запаленне міндалін, 12. волат, 13. пашкоджанне машыны ў час працы, 15. кустовая калючая ягадная расліна сямейства ружакветных, 16. сканцэнтраванасць думак, 17. італьянскі горад у П'емонце на рацэ Танара альбо белае аблачэнне ксяндза.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 25 нумара

Гарызантальна: брага, лайдацтва, кукса, тытул, лес, шыншыла, пухліна, два, Арнем, парча, аграномія, сетка.

Вертыкальна: багацце, бойка, актэт, Лукашэнка, артылерыя, крыха, лінза, лад, Спа, відната, Маркс, пампа.

Рашэнне: **Маладая лаза выгнецца куды хочаш**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Васілю Петручуку** з Беластока і **Надзеі Сцяпанавай** з Віцебска.

Усё праз тую Ядзю!

Не магу сцярпець суседзяў, асабліва Ядзю-пляткарку. Усе яны пранырлівыя, а перш за ўсё тая старая Ядзя. Сядзіць на лаўцы ля пад'езда нашага блёка і балбоча, балбоча, балбоча, абгаворвае каго ўдасца і калі ўдасца, перамывае ўсе костачкі, нават калі на зямлю апускаецца змрок, і сама да сабе балбоча, калі не мае слухача. У дадатку яе балкон — па-суседску з маім!..

Цяпер, у спёку, сяджу дома. Сціраю, прыбіраю, гляджу ў тэлевізар. Калі мне трэба выйсці, дык тады толькі, каб выгуляць сабаку (здаецца, папраўдзе ён выгульвае мяне). Кантакт са светам у мяне аднабаковы. Адключылі мой тэлефон з-за неаплачаных рахункаў. Да мяне можаце яшчэ дазваніцца, а я да вас — не. Ну, дык і добра. Прынамсі буду мець ашчаднасць на чарговым рахунку. Праўду кажа сучасная прымаўка: „Jak się nie ma co się lubi, to się lubi swoje długi". Дарэчы, хамства якое, гляньце! Як так можна! Не заплаціў, дык заплачу! А тыя — узялі дый адключылі!..

Так вось у тыя спякотныя дні гаспадарую сабе ў сваёй трохпакаёвай хаце. Сабака ляжыць пад фатэлем і цяжка дыхае. Гэта не яго віна, што не можа сабе папацець, бо ж яму натура не дала адпаведных залозаў. Ды чаго ж ён так зяпае, бестыя!.. На мінулым тыдні, калі тэмпература скочыла больш за 30° па Цэльсію, спрабаваў я трываць у нерухомасці. Так толькі дрыгну — ад пакоя да кухні. Пасля поўдня, стомлены жарам, рашыў я падрамаць. Калі заплюшчыў вока і стаў сонна трызніць, дайшоў да майго носа пах гару. Ну, урэшце прытрапілася гэтай урэднай Ядзюні-пляткарцы! Зрабілася мне добра і шчасна. Напоўніла маё нутро радасць і сатысфакцыя ад помсты, якая, праўда, не была маім непасрэдным удзелам, але і так Ядзя атрымала тое, што даўно ёй належыцца! Чым больш я ўхмыляўся ў сваім паўсне ад помслівай радасці, тым больш інтэнсіўна чуў пах гару. Сабака дыхацеў. Ах ты, пракляты сабака і твая сабачая натура!.. Урэшце той пракудны пах зрабіўся такі невыносны, што выбіў мяне з дрымоты. Я ўстаў.

— Завару сабе зялёнае гарбаты, — падумаў я. — Яна добрая на такую спёку.

А ў кухні — дым.

— А я пітолю, мой рыс! — віснуў я ў адчаі.

З рысу, так сказаць, адзін пшык, і гаршчок таксама на сметнік. Усё з-за тае Ядзі!... Якое ў яе права дурыць мне галаву?! Хай верне мне мой страчаны эмалевы рондаль! І рыс, вядома. А што?

МакХолад

ISSN 0546-1960